# МУЗЕЙНАЯ АЗНАЯМЛЯЛЬНАЯ ПРАКТЫКА

***Метадычныя рэкамендацыі***

Репозиторий ВГУ

*2010*

УДК 069(075.8)
ББК 79.1р30
М89

Аўтары-складальнікі: дацэнт кафедры гісторыі Беларусі УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, кандыдат гістарычных навук **А.М. Дулаў;** старшы навуковы супрацоўнік Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа (г. Мінск); **Н.В. Трафімчык;** старшы выкладчык кафедры гісторыі Беларусі УА “ВДУ імя П.М. Машэрава” **Дз.В. Юрчак**

Рэцэнзенты:
дырэктар установы культуры “Віцебскі абласны краязнаўчы музей” *Г.Ул. Савіцкі;*
начальнік навукова-даследчага сектара УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт *А.Л. Дзядзінкін*

Рэпозиторий ВГУ

Метадычныя рэкамендацыі раскрываюць задачы і змест музейнай (азнаямляльнай) практыкі, змяшчаюць тэарэтычны мінімум, неабходны студэнтам для эфектыўнай арганізацыі сваёй працы падчас практыкі, а таксама дапаможны матэрыял і прыклады афармлення справаздачнай дакументацыі.

Прызначаны для студэнтаў другога курса гістарычнага факультэта спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па накірунках).

**УДК 069(075.8)**
**ББК 79.1р30**

© УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2010

# УВОДЗІНЫ

Вучэбныя практыкі займаюць важнае месца ў працэсе падрыхтоўкі сучаснага высокакваліфікаванага спецыяліста ў галіне музейнай справы і аховы гісторыка-культурнай спадчыны. Адной з такіх практык з’яўляецца вучэбная музейная (азнаямляльная) практыка студэнтаў другога курса спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па накірунках) на гістарычным факультэце ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава”. Практыка праводзіцца пасля летняй экзаменацыйнай сесіі на працягу двух тыдняў і ўключае ў сябе 12 працоўных дзён.

Мэтай музейнай (азнаямляльнай) практыкі выступае падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў праз непасрэднае азнаямленне студэнтаў з сучаснай музейнай сеткай Рэспублікі Беларусь, фарміраванне ў будучых спецыялістаў-музеязнаўцаў уяўлення пра асноўныя накірункі работы сучасных музеяў розных профіляў.

Базамі практыкі выступаюць вядучыя музеі горада Віцебска, Віцебскай вобласці і Мінска. Наведванне музеяў адбываецца ў комплексе з краязнаўчымі экскурсіямі, што дазваляе замацаваць атрыманыя на занятках веды, пашырыць агульны і прафесійны кругагляд студэнтаў.

Асноўнай формай справаздачнай дакументацыі з’яўляецца дзённік, у якім адлюстроўваецца выкананая работа. Бягучая праверка дзённікаў праводзіцца на працягу практыкі групавымі кіраўнікамі-метадыстамі. Напрыканцы практыкі студэнты рыхтуюць індывідуальныя заданні – пісьмовы аналіз работы і экспазіцыі аднаго з наведаных музеяў. Гэтае заданне носіць “апераджальны” характар, бо ў студэнтаў яшчэ недастаткова тэарэтычных ведаў для глыбокага аналізу дзейнасці музеяў, таму ацэньваецца самастойнасць, арыгінальнасць мыслення, творчы падыход. Па выніках практыкі студэнты таксама рыхтуюць агульную пісьмовую справаздачу.

Завяршае практыку выніковая канферэнцыя, напярэдадні якой студэнты прадстаўляюць справаздачную дакументацыю. На канферэнцыі аналізуюцца і абагульняюцца вынікі працы. Па выніках работы студэнта ў час практыкі і пры наяўнасці справаздачнай дакументацыі, якая адпавядае прад’яўляемым патрабаванням, выстаўляецца залік.

Дзякуючы праходжанню практыкі студэнты маюць магчымасць пазнаёміцца з вядучымі рэспубліканскімі музеямі і музеямі Віцебскага рэгіёна, атрымаць уяўленне аб профільных асаблівасцях літаратурных, мастацкіх, гістарычных, комплексных музеяў, даведацца пра



Репозиторий ВГУ

асаблівасці пабудовы экспазіцый, змест фондавай і навукова-асветнай работы музеяў. У час практыкі замацоўваюцца веды, атрыманыя на аўдыторных занятках па шэрагу дысцыплін (археалогія, этнаграфія, гісторыя Беларусі і інш.). Практыка спрыяе фарміраванню патрыятычных пачуццяў і пашырэнню кругагляду.

У мэтах павышэння якасці і эфектыўнасці правядзення музейнай (азнаямляльнай) практыкі на гістарычным факультэце УА “ВДУ імя П.М. Машэрава” з улікам шматгадовага вопыту складзены дадзеныя метадычныя рэкамендацыі. Яны дадуць магчымасць студэнтам самастойна азнаёміцца з прад’яўляемымі да іх патрабаваннямі, эфектыўна арганізаваць сваю працу падчас практыкі, правільна аформіць дзённік і іншую справаздачную дакументацыю.

Аўтары-складальнікі выказваюць шчырую падзяку за каштоўныя парады і заўвагі рэцэнзентам: дырэктару установы культуры “Віцебскі абласны краязнаўчы музей” Глебу Уладзіміравічу Савіцкаму, які падчас працы на кафедры заклаў асновы практыкі ў яе сучасным выглядзе, і начальніку навукова-даследчага сектара УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, кандыдату гістарычных навук, дацэнту Аляксандру Леанідавічу Дзядзінкіну. Таксама шчыра дзякуем кіраўнікам і супрацоўнікам музеяў Віцебшчыны і Мінска, без спагадлівага стаўлення і прафесіяналізму якіх правядзенне практыкі было б немагчымым. Вялікі дзякуй студэнтам гістарычнага факультэта і асабіста Саўчанцы Дар’і Сяргееўне і Пухавіцкай Юліі Сямёнаўне, якія ласкава пагадзіліся прадставіць для публікацыі ў якасці ўзораў сваю справаздачную дакументацыю.

Репозиторий ВГУ

# МЭТА, ЗАДАЧЫ І ЗМЕСТ ПРАКТЫКІ

Мэта музейнай (азнаямляльнай) практыкі: азнаямленне студэнтаў з музейнай сеткай Рэспублікі Беларусь, фарміраванне ў будучых спецыялістаў-музеязнаўцаў уяўлення пра асноўныя накірункі работы сучасных музеяў розных профіляў.

Задачы музейнай (азнаямляльнай) практыкі:

- паглыбленне і замацаванне тэарэтычных ведаў, набытых у рамках вывучэння курсаў па спецыяльнасці;
- азнаямленне з вядучымі музеямі і музейнай сеткай Рэспублікі Беларусь і Віцебскай вобласці;
- фарміраванне агульных уяўленняў пра экспазіцыі і калекцыі сучасных музеяў, выпрацоўка ведаў пра асноўныя тыпы і профілі музеяў з мэтай лепшага засваення лекцыйных курсаў, што будуць чытацца пры далейшым навучанні па спецыяльнасці;
- развіццё аналітычных навыкаў і крытычнага мыслення;
- выхаванне пачуцця патрыятызму і паважлівага стаўлення да гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

Музейная азнаямляльная практыка праводзіцца на аснове загадзя складзенага графіку, які адпавядае праграме практыкі і падрыхтаваны ў адпаведнасці з графікам вучэбнага працэсу. Графік правядзення практыкі штогадова зацвярджаецца кафедрай гісторыі Беларусі на аснове прыкладнага плану практыкі. Правядзенне заняткаў плануецца па днях на ўвесь тэрмін практыкі. Да пачатку практыкі зацверджаны графік даводзіцца да студэнтаў, а копіі графіка перадаюцца старастам груп.

Прыкладны план правядзення практыкі выглядае наступным чынам:

У першы дзень практыкі праводзіцца ўстановачная канферэнцыя, на якой факультэцкі і групавыя кіраўнікі знаёмяць студэнтаў з мэтай, задачамі і зместам практыкі, прад’яўляемымі да практыкантаў патрабаваннямі і формамі справаздачнасці аб зробленай рабоце, даюць метадычныя рэкамендацыі па вядзенні дакументацыі. Праводзіцца інструктаж па тэхніцы бяспекі.

Акрамя таго, першы дзень практыкі ўключае наведванне і знаёмства з дзейнасцю філіяла Віцебскага абласнога краязнаўчага музея – Музея-сядзібы І.Я. Рэпіна “Здраўнёва”.

Другі дзень практыкі прадугледжвае наведванне і знаёмства з экспазіцыйна-выставачнай, фондавай і навуковай дзейнасцю Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны (Аршанскі этнаграфічны музей “Млын”, Мемарыяльны музей Героя Савецкага



Рэпозиторий ВГУ

Саюза К. Заслонава, Музей гісторыі і культуры г. Орша, Аршанскі музей У.С. Караткевіча, Музей драўлянай скульптуры разьбяра С.С. Шаўрова).

Трэці дзень практыкі ўключае наведванне Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка і знаёмства з дзейнасцю яго філіялаў (Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора, Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я, Стацыянарная выстава "Прагулка па Ніжняй Пакроўскай", Дзіцячы музей, Прыродна-экалагічны музей, Полацкі краязнаўчы музей, Полацкі музей беларускага кнігадрукавання і інш.).

Чацвёрты дзень практыкі складаецца са знаёмства з экспазіцыйна-выставачнай, фондавай і навуковай дзейнасцю краязнаўчых музеяў на прыкладзе Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Падчас гэтага адбываецца наведванне пастаянных экспазіцый музея ("Старажытны Віцебск", "Прырода Віцебскага краю" і інш).

У пяты дзень практыкі працягваецца работа на базе Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Студэнты наведваюць пастаянныя экспазіцыі музея ("Экспазіцыя памяці патрыётаў Віцебшчыны", "Абаронцы Айчыны") і дзеючыя на момант правядзення практыкі часовыя выставы.

Шосты дзень практыкі прадугледжвае знаёмства з асаблівасцямі дзейнасці мастацкіх музеяў на прыкладзе філіяла Віцебскага абласнога краязнаўчага музея (Мастацкі музей). Прадугледжваецца наведванне пастаянных экспазіцый і часовых выстаў Мастацкага музея.

Сёмы дзень практыкі прадугледжвае наведванне музеяў г. Мінска. У прыватнасці, знаёмства з асаблівасцю экспазіцыйна-выставачнай дзейнасці і зместам фондаў нацыянальных і дзяржаўных музеяў рэспублікі (Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны).

У восьмы дзень практыкі адбываецца знаёмства з дзейнасцю літаратурных музеяў Мінска (Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа, Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы, Літаратурны музей Максіма Багдановіча і інш.).

У дзевяты дзень практыкі студэнты даведваюцца пра асаблівасці дзейнасці прыродазнаўчых, этнаграфічных, археалагічных і ведамасных музеяў на прыкладзе музеяў г. Мінска.

Дзесяты дзень практыкі прадугледжвае знаёмства з асаблівасцямі дзейнасці філіялаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея – Літаратурнага музея і Музея прыватных калекцый, а таксама наведванне і знаёмства з выставачнай залай Цэнтра культуры "Віцебск" "Духаўскі круглік".



Рэпазіторый ВГУ

У адзінаццаты дзень практыкі адбываецца наведванне Віцебскага абласнога музея Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова, Віцебскага музея воінаў-інтэрнацыяналістаў, выставачнай залы Цэнтра народных рамёстваў і мастацтваў "Задзвінне", а таксама асобных ведамасных музеяў.

На дванаццаты дзень практыкі прыходзіцца канчатковае афармленне выніковай дакументацыі і правядзенне заключнай канферэнцыі з выстаўленнем заліку.

Прыведзены план з'яўляецца прыкладным. Ён можа стаць асновай для складання графіку правядзення практыкі, але з улікам розных абставін (святаў, выхадных дзён у музеях, наяўнасці транспарта і г.д.) у прыкладны план могуць быць унесены істотныя змены. Больш таго, прыведзены пералік музейных устаноў пры наяўнасці магчымасці і фінансавых сродкаў можа быць пашыраны за кошт іншых вядомых музеяў рэспублікі (гісторыка-культурнага музея-запаведніка "Заслаўе", музеяў г. Гродна і інш.).

Репозиторий ВГУ

## ТЭАРЭТЫЧНЫ МІНІМУМ

Для эфектыўнай работы студэнта-практыканта неабходны мінімум тэарэтычных ведаў. У той жа час асноўныя тэарэтычныя дысцыпліны па спецыяльнасці чытаюцца на старэйшых курсах. Таму для пераадолення ўзнікаючых праблем студэнту перад пачаткам працы па напісанню дзённіка практыкі і складанню справаздачнай дакументацыі неабходна азнаёміцца з прыведзенай ніжэй інфармацыяй і засвоіць асноўныя музеязнаўчыя паняцці.

### ПАНЯЦЦЕ “МУЗЕЙ”. АСНОЎНЫЯ ФУНКЦЫІ СУЧАСНАГА МУЗЕЯ

Тэрмін “музей” паходзіць ад грэчаскага слова “museion”, якім называлі храмы муз і ўвогуле мясціны, прысвечаныя музам, навуцы, паэзіі, мастацтву. У эпоху Сярэднявечча, калі сышлі ў нябыт многія традыцыі і інстытуты антычнага свету, паняцце “мусейон” выйшла з ужытку. Другое жыццё яму падарыла эпоха Адраджэння, але пры гэтым напоўніла яго новым сэнсам. Музеем пачалі называць калекцыі помнікаў антычнасці, твораў мастацтва, а таксама ўсяго таго, што ўспрымалася ў якасці “рэдкасці” і “дзівосаў”. З другой паловы XVI ст. тэрмін “музей” усё часцей пачынаюць выкарыстоўваць не толькі ў дачыненні да збору прадметаў, але і да памяшкання, у якім ён захоўваецца і экспануецца.

З’яўленню новага аспекта ў сваёй трактоўцы музей абавязаны эпосе Асветніцтва. У гэты час са збору, які даступны толькі абмежаванаму колу людзей, музей ператвараецца ва ўстанову, якая адкрыта для шырокай публікі, а яго вызначальнай прыкметай становіцца не толькі наяўнасць калекцыі, яе захаванне і вывучэнне, але і паказ.

У нашыя дні існуе цэлы шэраг азначэнняў музея, што ў значнай ступені тлумачыцца складанасцю гэтага феномена. У міжнароднай практыцы звычайна выкарыстоўваецца азначэнне, распрацаванае Міжнародным саветам музеяў (ICOM):

***Музей*** – гэта некамерцыйная пастаянная ўстанова, закліканая служыць грамадству і спрыяць яго развіццю, што адкрыта для публікі і займаецца набыццём, захаваннем, даследваннем, папулярызацыяй і экспанаваннем матэрыяльных сведчанняў пра чалавека і акаляючае яго асяроддзе з мэтамі іх вывучэння, адукацыі і правядзення вольнага часу без аніякіх абмежаванняў тэрытарыяльнага характару, функцыянальнай структуры, складу калекцый з боку кіруючых колаў.

У сферы культуры музеі разам з помнікамі, гістарычнымі мясцінамі, архівамі і бібліятэкамі ўтвараюць вельмі шырокае паняцце – гісторыка-культурная спадчына. Месца музея ў любым грамадстве вызначаецца яго сацыяльнымі функцыямі – тымі задачамі, якія грамадства перад ім ставіць і патрабаваннямі, што прад’яўляюцца да яго. На дадзены момант у музеяў дакладна выкрысталізаваліся ***чатыры асноўныя функцыі:***

1. *Навукова-дакументацыйная* – рэалізуецца праз фарміраванне калекцый, якія характарызуюць развіццё прыроды і грамадства; музейныя калекцыі ўтвараюць музейныя зборы.

2. *Ахоўная* – музейныя зборы закліканы гарантавана ахоўваць арыгінальныя культурныя каштоўнасці народа ад крадзяжу, згубы, страт.

3. *Даследчая* – рэалізуецца праз даследаванне калекцый як першакрыніц ведаў.

4. *Адукацыйна-выхаваўчая* – рэалізуецца праз экспазіцыі, выставы і музейна-педагагічныя заняткі, якія з дапамогаю арыгінальных музейных рэчаў фарміруюць у грамадзян навыкі гістарычнага мыслення, гістарычную свядомасць ці запаўняюць гэтыя сферы (мысленне і свядомасць) ідэалагічнымі клішэ і стэрэатыпамі.

## КЛАСІФІКАЦЫЯ МУЗЕЯЎ

Кожны з музеяў непаўторны. І разам з тым у складзе іх збораў, маштабе дзейнасці, юрыдычным становішчы і іншых характарыстыках ёсць некаторыя агульныя рысы, якія дазваляюць ажыццявіць пэўную класіфікацыю.

Адной з важнейшых катэгорый класіфікацыі з’яўляецца ***профіль музея***, гэта значыць яго спецыялізацыя. Галоўнай прыкметай класіфікацыі тут выступае сувязь музея з канкрэтнай навукай ці відам мастацтва, тэхнікай, вытворчасцю ці яе галінамі. Гэта сувязь прасочваецца ў складзе фондаў музея, у тэматыцы яго навуковай, экспазіцыйнай і культурна-асветніцкай дзейнасці.

Музеі адной спецыялізацыі, гэта значыць аднаго профілю, аб’ядноўваюцца ў **профільныя групы**:

1. **Гістарычныя музеі:**

- агульнагістарычныя;
- археалагічныя;
- этнаграфічныя;
- ваенна-гістарычныя (прысвечаныя гісторыі ваенных падзей);



Репозиторий ВГУ

- музеі гісторыі рэлігіі;
- персанальныя гістарычныя музеі (прысвечаныя дзейнасці канкрэтнага чалавека);
- манаграфічныя гістарычныя музеі (прысвечаныя гісторыі асобнай падзеі).

**2. Мастацкія музеі:**
- музеі выяўленчага мастацтва;
- музеі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва;
- музеі народнага мастацтва;
- палацава-дэкаратыўнага і паркавага мастацтва;
- персанальныя мастацкія музеі;
- манаграфічныя мастацкія музеі.

**3. Мастацтвазнаўчыя:**
- тэатральнага мастацтва;
- музычнага мастацтва і музычных інструментаў;
- фота- і кінамастацтва;
- персанальныя мастацтвазнаўчыя музеі;
- манаграфічныя мастацтвазнаўчыя музеі.

**4. Архітэктурныя музеі:**
- архітэктурныя музеі шырокага профілю;
- музеефікаваныя помнікі архітэктуры і горадабудаўніцтва;
- музеі народнага дойлідства;
- персанальныя архітэктурныя музеі.

**5. Літаратурныя музеі:**
- літаратурныя музеі шырокага профілю;
- музеі гісторыі кнігі і кнігадрукавання;
- персанальныя літаратурныя музеі;
- манаграфічныя літаратурныя музеі.

**6. Прыродазнаўчыя музеі:**
- палеанталагічныя;
- антрапалагічныя;
- біялагічныя;
- батанічныя;
- заалагічныя;
- мінералагічныя;
- геалагічныя;

Репозиторий ВГУ

- геаграфічныя;
- медыцынскія;
- іншыя.

7. **Тэхнічныя музеі:**

- політэхнічныя музеі шырокага профілю;
- музеі па галінам тэхнікі (авіяцыі, сувязі, транспарта, касманаўтыкі і інш.);
- персанальныя тэхнічныя музеі;
- манаграфічныя тэхнічныя музеі.

8. **Галіновыя музеі:**

- сельскагаспадарчыя музеі;
- музеі адукацыі (педагагічныя, музеі навучальных устаноў, дзіцячыя музеі);
- музеі аховы здароўя;
- музеі спорта;
- манаграфічныя музеі.

Акрамя таго, існуюць яшчэ музеі **комплекснага профілю**, зборы і дзейнасць якіх звязаны з некалькімі навуковымі дысцыплінамі ці галінамі ведаў. Самымі распаўсюджанымі сярод іх з'яўляюцца ***краязнаўчыя музеі***, якія спалучаюць у сабе як мінімум гістарычную і прыродазнаўчую спецыялізацыі. Комплексным профілем валодаюць таксама і ***музеі-ансамблі***, створаныя на аснове помнікаў архітэктуры, іх інтэр'ераў, акаляючага асяроддзя.

Разам з профільнай класіфікацыяй выкарыстоўваецца і ***тыпалагічны падзел***. Так, у адпаведнасці з тыпалогіяй *па прыкмеце грамадскага прызначэння* можа быць вылучана тры **тыпы музеяў**:

**1. Група навукова-асветніцкіх (масавых) музеяў.** Музеі гэтага тыпу скіраваны ў першую чаргу на масавага наведвальніка, іх фонды шырока выкарыстоўваюцца ў культурна-асветніцкіх мэтах. У дзейнасці такіх музеяў вялікая ўвага надаецца стварэнню экспазіцый, выстаў і правядзенню разнастайных культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў.

**2. Навукова-даследчая (акадэмічная) група музеяў.** Гэтыя музеі функцыянуюць пры навукова-даследчых інстытутах і акадэміях навук. Іх фонды выкарыстоўваюцца ў навуковых мэтах, а экспазіцыі накіраваны ў першую чаргу на спецыялістаў. Сярод беларускіх музеяў гэты тып сустракаецца вельмі рэдка. Адзін з прыкладаў — музей старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства,

Рэпазіторый ВГУ

этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь.

**3. Група вучэбных музеяў.** Асноўным прызначэннем дадзенага тыпу музеяў з'яўляецца забеспячэнне арганізацыі навучальнага працэсу з дапамогаю музейных рэчаў. Гэтай мэце падначалена структура музеяў, фарміраванне калекцый і пабудова экспазіцый. Прыкладамі можна назваць як музей крыміналістыкі ў Акадэміі міліцыі, так і звычайныя грамадскія музеі ў навучальных установах і школах рэспублікі.

Існуе і іншая тыпалогія музеяў, у адпаведнасці з якой вылучаюць музеі калекцыйнага тыпу і музеі ансамблевага тыпу. Музеі **калекцыйнага тыпу** будуюць сваю дзейнасць на аснове традыцыйнага збору рэчавых, пісьмовых, выяўленчых матэрыялаў, якія адпавядаюць іх профілю. У аснове дзейнасці музеяў **ансамблевага тыпу** палягаюць помнікі архітэктуры з іх інтэр'ерамі, акаляючым асяроддзем. Найбольш распаўсюджаныя формы гэтага тыпу музеяў – музей пад адкрытым небам, дом-музей, музей-кватэра, музей-майстэрня.

Сярод музеяў пад адкрытым небам існуе асобая група музеяў, якія ствараюцца на аснове нерухомых помнікаў, музеефікаваных на месцы іх знаходжання з захаваннем ці аднаўленнем гісторыка-культурнага і прыроднага асяроддзя. Па прычыне сваёй асаблівай каштоўнасці яны маюць статус **музеяў-запаведнікаў** (Полацкі і Нясвіжскі гісторыка-культурныя музеі-запаведнікі, гісторыка-культурны музей-запаведнік "Заслаўе").

Асобую тыпалагічную групу ўяўляюць **мемарыяльныя музеі**, якія ствараюцца з мэтай захавання памяці пра выбітных людзей і знамянальныя падзеі.

Даследчыкі вылучаюць і іншыя прынцыпы класіфікацыі, якія не супадаюць ні з профільным падзелам, ні з тыпалогіяй. Так, у аснове класіфікацыі музеяў можа палягаць ***адміністрацыйна-тэрытарыяльная прыкмета***, у адпаведнасці з якой вылучаюць:

- рэспубліканскія музеі;
- абласныя музеі;
- раённыя музеі.

Па сваім ***юрыдычным становішчы*** музеі падзяляюцца на:

- дзяржаўныя музеі (музеі, якія з'яўляюцца дзяржаўнай маёмасцю і фінансуюцца з дзяржаўнага бюджэту);
- грамадскія музеі (музеі, якія створаны па ініцыятыве грамадскасці і функцыянуюць на грамадскіх пачатках, але пад

навукова-метадычным кіраўніцтвам дзяржаўных музеяў. Ствараюцца пры органах культуры, у школах, разнастайных установах);

- прыватныя музеі (музеі, даступныя для вывучэння і агляду, у аснове якіх ляжаць зборы, што належаць прыватным асобам).

У асобную групу можна вылучыць **ведамасныя музеі**, якія выкарыстоўваюцца як у вучэбных мэтах (музеі навучальных устаноў, музей крыміналістыкі ў акадэміі міліцыі), так і ў культурна-асветніцкіх мэтах для папулярызацыі сярод насельніцтва дзейнасці той ці іншай установы (Музей ДАІ, Пажарна-тэхнічная выстава Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС).

Сукупнасць музеяў, якія існуюць на пэўнай тэрыторыі, называюць ***музейнай сеткай***. Тыпалогія музеяў Беларусі адрозніваецца адноснай разнастайнасцю. Тут прысутнічаюць амаль усе вядомыя нам тыпы і профілі музейных устаноў. Па профілю дзяржаўныя музеі размяркоўваюцца наступным чынам: краязнаўчыя (50%), гістарычныя (17%), мастацтвазнаўчыя (18%), літаратурныя і літаратурна-мемарыяльныя (10%), музеі-запаведнікі (2%), прыродазнаўчыя (2%), іншыя (1%). У сваёй дзейнасці музеі Беларусі кіруюцца Законам аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь (гл. Дадатак 1).

## МУЗЕЙНАЯ ЭКСПАЗІЦЫЯ

Слова “экспазіцыя” паходзіць ад лацінскага дзеяслова “expono” (выстаўляць напаказ, раскладваць) і вытворнага ад яго назоўніка “expositio” – апісанне. Экспазіцыяй можна назваць размяшчэнне любых прадметаў, прадстаўленых для агляду. Але музейная экспазіцыя мае сваю спецыфіку: яе аснову складаюць не любыя, а музейныя прадметы.

***Музейны прадмет*** – гэта культурная каштоўнасць або выдзелены з навакольнага асяроддзя ў выніку навуковай дзейнасці унікальны прыродны аб’ект, які мае культурную, гістарычную, навуковую і (або) мастацкую вартасць і ўключаны ў музейны фонд у мэтах захавання, вывучэння і папулярызацыі.

У экспазіцыі музейныя прадметы набываюць новы статус: становяцца ***экспанатамі***, гэта значыць прадметамі, якія выстаўлены для агляду. У якасці экспанатаў могуць выступаць і копіі музейных прадметаў, а таксама карты, схемы і іншы навукова-дапаможны матэрыял, які неабходны для дэманстрацыі сувязей паміж прадметамі і раскрыцця тэмы.

Рэпазіторый ВДУ

Такім чынам, ***музейная экспазіцыя*** – гэта мэтанакіраваная, навукова абгрунтаваная дэманстрацыя музейных прадметаў, кампазіцыйна арганізаваных, каментаваных, тэхнічна і мастацка аформленых, якія ствараюць спецыфічны музейны вобраз прыродных і грамадскіх з'яў. Музейная экспазіцыя ўзнікае ў сувязі з неабходнасцю выкарыстання музейнага збору ў асветніцкіх мэтах, а таксама для эмацыйнага ўздзеяння на наведвальніка. Аснову экспазіцыі складае ***навуковая канцэпцыя***, якая вызначае яе змест, прынцып адбору экспанатаў, агульнае мастацкае вырашэнне.

Музейныя прадметы, арганізаваныя ў пэўным лагічным парадку, раскрываюць тую ці іншую тэму. Пры адборы музейных прадметаў для экспазіцыі праводзіцца іх дадатковае вывучэнне з мэтай вызначэння магчымасці экспанатаў перадаваць інфармацыю і эмацыйна ўздзейнічаць на наведвальнікаў. На першых этапах стварэння экспазіцыі неабходна сфармуляваць мэты экспазіцыі і метады яе пабудовы, вызначыць шляхі яе далейшага ўдасканалення, мастацкую каштоўнасць экспанатаў і ступень іх эстэтычнага ўздзеяння.

Існуюць *агульныя прынцыпы пабудовы экспазіцыі*:

- прынцып ідэйнасці (адпаведнасць экспазіцыі пэўнай ідэі, якая вызначана аўтарамі – музейнымі спецыялістамі);
- прадметнасці (галоўным складнікам экспазіцыі з'яўляецца музейны прадмет);
- дасціпнасці і універсальнасці (экспазіцыя павінна быць пабудавана з улікам яе ўспрымання рознымі групамі наведвальнікаў);
- нагляднасці (інфармацыя, якая ўтрымліваецца ў экспазіцыі, засвойваецца у першую чаргу дзякуючы зрокавым вобразам).

***Асноўныя віды экспазіцыі*** вызначаюцца метадамі іх пабудовы:

1. **Ландшафтная экспазіцыя** – музейная экспазіцыя, якая адлюстроўвае ўзаемаспалучэнні, узаемасувязі і ўзаемазалежнасць прыродных кампанентаў. Яе асноўная структурная адзінка – *біягрупы* (экспазіцыйны комплекс з аб'ектаў жывёльнага і (ці) расліннага свету) і ландшафтныя *дыярамы* (экспазіцыйны комплекс, які ствараецца шляхам сумяшчэння стужкападобнай (выгнутай у плане паўколам) жывапіснай карціны-задніка з аб'ёмным пярэднім планам, што з дапамогай адмысловага асвятлення і пры разглядзе праз спецыяльны праём стварае ілюзію рэальнай прасторы). Ландшафтныя экспазіцыі ў большасці характэрны для прыродазнаўчых музеяў.
2. **Сістэматычная экспазіцыя** – музейная экспазіцыя, пабудаваная ў адпаведнасці з класіфікацыйнай сістэмай канкрэтнай навуковай дысцыпліны ці галіны вытворчасці. Асноўная структурная



Репозиторий ВГУ

адзінка сістэматычнай экспазіцыі – сістэмны (тыпалагічны) шэраг музейных прадметаў, які адлюстроўвае эвалюцыйныя працэсы ў прыродзе і чалавечай дзейнасці. Найбольш часта сістэматычны метад выкарыстоўваецца ў прыродазнаўчых, археалагічных, этнаграфічных музеях.

3. **Ансамблевая экспазіцыя** – музейная экспазіцыя, якая захоўвае ці рэканструюе на дакументальнай аснове рэальнае асяроддзе жыцця канкрэтнага чалавека ці асяроддзе, тыповае для сацыяльнага пласту пэўнай эпохі. Структурнай адзінкай ансамблевага паказу з'яўляецца інтэр'ер, дзе музейныя прадметы прадстаўлены ў асяродку свайго бытавання дзякуючы ўзнаўленню тых сувязей, якія паміж імі існавалі. Ансамблевая кампазіцыя характэрна для мемарыяльных музеяў, для музеефікаваных помнікаў гісторыі і культуры – палацаў, сядзіб, сялянскіх хат. Яе прыкладам могуць служыць гістарычныя інтэр'еры ці іх фрагменты, якія ўзнаўляюцца ў музеях розных профіляў.

4. **Тэматычная экспазіцыя** – музейная экспазіцыя, якая пасродкам музейных прадметаў раскрывае пэўную тэму, сюжэт, праблему, стварае музейны вобраз тых падзей ці з'яў, якія адлюстроўвае. Такая экспазіцыя ўяўляе сабой сістэму ўзаемазвязаных і супадпарадкаваных раздзелаў і тэм, змест якіх абгрунтаваны канцэпцыяй. Асноўнай структурнай адзінкай тэматычнай экспазіцыі з'яўляецца тэматыка-экспазіцыйны комплекс, які ўяўляе сабой групу прадметаў розных тыпаў – рэчы, дакументы, выяўленчыя матэрыялы. Такі тып экспазіцыі з'яўляецца вядучым у гістарычных і краязнаўчых музеях.

Усе пералічаныя вышэй метады пабудовы музейнай экспазіцыі на практыцы часта спалучаюцца, што дазваляе разнастаіць экспазіцыю і спрыяе павышэнню яе ўздзеяння на гледача.

Па сваім прызначэнні музейныя экспазіцыі могуць быць *агульнадаступнымі* ці *спецыялізаванымі* – для канкрэтнай групы наведвальнікаў (напрыклад, у навукова-даследчых музеях). Музейныя экспазіцыі, якія ствараюцца ў якасці часовых, называюцца ***выставамі***.

Рэпазіторый ВДУ

## МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ПРАХОДЖАННІ ПРАКТЫКІ І АФАРМЛЕННІ ДАКУМЕНТАЦЫІ

Музейная (азнаямляльная) практыка адбываецца ў форме групавога наведвання студэнтамі вызначаных музеяў адпаведна графіку праходжання практыкі. У час знаходжання ў музеі студэнт павінен азнаёміцца з гісторыяй яго стварэння, вызначыць месца размяшчэння, запісаць кантактныя тэлефоны (гэта можа спатрэбіцца ў далейшай працы ў музейнай ці турыстычнай сферы) і даць апісанне музея адпаведна прад’яўляемым да дзённікаў патрабаванням.

Калі студэнт па якой-небудзь прычыне не змог наведаць музей з групай, ён павінен гэта зрабіць у індывідуальным парадку па ўзгадненні з кіраўнікамі практыкі. Пры гэтым адпрацоўка прапушчаных без уважлівых прычын заняткаў адбываецца ў адпаведнасці з універсітэцкім палажэннем “Аб частковым вяртанні сродкаў, затрачаных універсітэтам на правядзенне вучэбнай работы па-за раскладам” і прадугледжвае выкананне дадатковага індывідуальнага задання. Дакументам, які падцвярджае індывідуальнае наведванне музея, з’яўляецца квіток адпаведнай установы. Для спрашчэння працы студэнтаў у індывідуальным парадку ў метадычцы падрыхтаваны пералік асноўных музеяў, якія могуць быць наведаны, з указаннем іх размяшчэння і кантактных тэлефонаў (гл. Дадатак 4).

Пры індывідуальным наведванні музейных устаноў у час практыкі і пры далейшай працы ў музеях і турбізнесе трэба памятаць, што не ўсе музеі можна наведаць у любы час пры наяўнасці на тое жадання. У сваёй большасці пры наведванні ведамасных музеяў неабходна загадзя ўзгадніць свой прыход з асобай, адказнай за работу музея. Гэта абумоўлена тым, што ў многіх дзяржаўных установах загадчыкі музеяў працуюць па сумяшчальніцтву, а часам і на грамадскіх пачатках, таму яны могуць быць занятымі па асноўным месцы працы. Больш таго, для наведвання асобных ведамасных музеяў (музеяў міліцыі, мытні і г.д.) неабходна наяўнасць згоды на гэта кіраўніка адпаведнай установы. Для гэтага трэба папярэдне падрыхтаваць адносіну (пісьмовы зварот) з указаннем прычын наведвання адпаведнага музея, прыкладнай даты і часу, якія пасля атрымання згоды кіраўніцтва могуць быць удакладнены з загадчыкам музея.

У час наведвання музея студэнт абавязаны весці **дзённік** ці рабіць чарнавыя запісы ў нататнік, якія затым стануць асновай для напісання дзённіка. Усе музеі, якія будуць наведаны ў межах практыкі, павінны быць апісаны ў дзённіку па наступным плане:



Рэпазіторый ВГУ

1. Назва музея.
2. Тып, профіль музея.
3. Поўны адрас, тэлефон.
4. Кіраўнік музея.
5. Дата заснавання музея.
6. Найбольш цікавыя калецыі.
7. Музейная экспазіцыя:
   – назва экспазіцыі,
   – від экспазіцыі,
   – асноўныя раздзелы экспазіцыі,
   – найбольш цікавыя экспанаты (не менш 5).
8. Асабістая ацэнка працы музея і ўзроўню экскурсіі.

Прыкладны варыянт афармлення тытульнага аркуша дзённіка і апісання музея ці музейнай экспазіцыі глядзіце ў Дадатку (Дадатак 4.1, 4.2).

Пры запаўненні дзённіка неабходна карыстацца тымі тэарэтычнымі распрацоўкамі, якія прыведзены ў дадзенай метадычцы ці іншых спецыялізаваных выданнях па музеязнаўству. Як паказвае практыка, найбольшыя праблемы пры апісанні музеяў у дзённіку ўзнікаюць з вызначэннем тыпу і профілю музеяў, а таксама пры вызначэнні віду экспазіцыі. Асобныя студэнты замест віду экспазіцыі пісалі проста яе назву, што недапушчальна. Таму да гэтага пытання трэба ставіцца асабліва ўважліва.

Некаторыя складанасці ў афармленні дзённіка становяцца вынікам няведання студэнтамі асобных музейных паняццяў і тэрмінаў, таму і з'яўляюцца замест "этыкетажа" – "паперкі з надпісамі пад экспанатамі", замест "дыярам" – "дыяграмы" і г.д. Каб пазбегнуць падобных памылак пры ўзнікненні цяжкасцяў, лепей за ўсё звярнуцца да спецыялізаванай літаратуры ці проста запытацца ў выкладчыка.

Акрамя таго, больш уважліва трэба ставіцца да тэксту апісання экспазіцый, каб пазбегнуць элементарных моўных і лагічных памылак (напрыклад: "у зале прадстаўлены звяры беларускіх лясоў: бабры, лісіца, лось, *суніцы*(!?)"), ці скарачэнняў кшталту "*Музей СД*" (замест "Музей памяці патрыётаў Віцебшчыны", які размяшчаецца ў будынку былой турмы СД), "*Герой СС*" (замест "Герой Савецкага Саюза"), якія маюць цалкам супрацьлеглае значэнне і нават выглядаюць абразліва ва ўмовах шанавання памяці Герояў Вялікай Айчыннай вайны і 65-годдзя святкавання Перамогі.

Апісанне любой экспазіцыі і музея павінна завяршацца абагульняючымі вывадамі. У іх студэнт адзначае станоўчыя і адмоўныя моманты, якія ён заўважыў у музеі (экспазіцыі). Варта таксама зрабіць ацэнку працы экскурсавода (пры наяўнасці экскурсіі)



Репозиторий ВГУ

і паспрабаваць вызначыць, наколькі экскурсія адпавядае зместу самой экспазіцыі. Пры гэтым пажадана, каб студэнт выказаў і свае агульныя ўражанні ад музея, але не на ўзроўні “мне спадабалася” ці “мне не спадабалася”. Кожную ацэнку трэба паспрабаваць навукова абгрунтаваць і прывесці доказы адпаведнасці вашага сцвярджэння.

Дзённікі правяраюцца факультэцкім і групавымі кіраўнікамі практыкі ў час яе правядзення, а потым здаюцца на выніковую праверку для выстаўлення заліку. На трэцім курсе студэнтам вяртаюцца іх дзённікі, паколькі яны змяшчаюць карысны матэрыял для вывучэння курсу “Музеі Беларусі і Расіі” і могуць выкарыстоўвацца пры падрыхтоўцы да дзяржаўных экзаменаў.

Па *завяршэнні музейнай (азнаямляльнай) практыкі* студэнт павінен прадставіць кіраўніку *наступныя дакументы*:

1) запоўнены і завераны **дзённік** практыкі адразу пасля яе завяршэння;
2) **індывідуальнае заданне** па музею, які вызначае кіраўнік;
3) пісьмовую **справаздачу**, якая павінна змяшчаць інфармацыю пра канкрэтна выкананую работу, вывады і прапановы па арганізацыі практыкі.

Правільна запоўненая і своечасова здадзеная справаздачная дакументацыя пры адсутнасці пропускаў (ці пры ўмове іх адпрацоўкі) з’яўляецца падставай для выстаўлення заліку па практыцы.

Сваё індывідуальнае заданне студэнт атрымлівае перад пачаткам практыкі, каб мець магчымасць больш грунтоўна падрыхтавацца да яго выканання. Індывідуальнае заданне выконваецца толькі па тых музеях, якія будуць наведаны ў час практыкі. Для аналізу могуць быць прапанаваны як музей, так і асобныя яго экспазіцыі (у адносінах да буйных музеяў).

**Індывідуальнае заданне** выконваецца па наступнай схеме (прыклад афармлення тытульнага аркуша і выкарыстання дадзенай схемы для аналізу музея глядзіце ў Дадатку 4.3):

1. Назва музея.
2. Тып, профіль музея.
3. Дата заснавання музея.
4. Размяшчэнне музея (Дзе музей знаходзіцца? Ці лёгка яго знайсці? Як выглядае непасрэднае атачэнне музея? Якое дачыненне яно мае да музея і яго дзейнасці?).
5. Будынак музея (Што гаворыць пра тое, што гэта – музей? Як выглядае будынак, якое ўражанне ён пакідае? Гэта спецыяльна пабудаваны ці прыстасаваны будынак? Ці падыходзіць ён для размяшчэння музея? Як можна ацаніць знешнюю і ўнутраную архітэктуру?).



Репозиторий ВГУ

6. Уваход у музей (Наколькі прывабны ўваход? Ці лёгка яго адшукаць? Ці адчулі вы гасціннасць? Хто-небудзь заўважыў вас? Як паказана ўваходная плата, і як яна прымаецца? Ці пазначана на ўваходзе, што вам рабіць далей, куды ісці?).

7. Калекцыі музея (Што музей збірае? Калі пачалі ствараць калекцыі? Якія з калекцый найбольш каштоўныя? Ці ёсць умовы для працы даследчыкаў-візіцёраў? Ці ёсць бібліятэка?).

8. Публічная тэрыторыя музея (Якое ўражанне стварае прастора для наведвальнікаў? Ці клапоціцца музей пра сваіх наведвальнікаў? Як ахоўваецца музей?).

9. Выставы і экспазіцыі музея (Якія ў музея асноўныя выставы і экспазіцыі? Ці адпавядае змест экспазіцыі тэме, заяўленай у загалоўку? Пра што расказвае экспазіцыя? Наколькі экспазіцыя актуальна? Наколькі яна адпавядае музейнаму профілю? Ці падаецца прадстаўленне лагічным і збалансаваным? Ці ёсць анатацыі? Наколькі яны дапамагаюць? Ці маюцца дадатковыя сродкі прадстаўлення, такія, як аўдыёгіды, друкаваныя шляхаводнікі? Якога ўзросту экспазіцыя? Як забяспечаны кантроль за асвятленнем, тэмпературай і вільгаццю на экспазіцыйнай тэрыторыі? Ці ёсць умовы для часовага экспанавання? Хто прыходзіць у музей? Чаму? Хто не прыходзіць у музей? Чаму?).

10. Абслугоўванне наведвальніка (Што музеем надрукавана? Ці маюцца ў продажы паштоўкі з выявай калекцыйных прадметаў? Ці камфортнае гэта месца для знаходжання? Ці ёсць магчымасць прысесці, калі спатрэбіцца? Ці хочацца быць тут? Ці хацелася б вярнуцца?).

Пры афармленні індывідуальнага задання студэнт як спецыяліст гуманітарнага профілю павінен правільна аформіць тытульны аркуш і даць разгорнуты і абгрунтаваны адказ па ўсіх пунктах прапанаванага плана, а не абмяжоўвацца кароткімі адказамі (як пры запаўненні анкет).

Праграма практыкі прадугледжвае наступную (прыведзеную ніжэй) тэматыку індывідуальных заданняў, якая можа быць дапоўнена пры наведванні ў час практыкі іншых, не ўключаных у гэты спіс музеяў.

1. Віцебскі абласны краязнаўчы музей (і яго філіялы).
2. Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова.
3. Выставачная зала Цэнтра культуры “Віцебск” “Духаўскі круглік”.
4. Віцебскі музей воінаў-інтэрнацыяналістаў.
5. Выставачная зала Цэнтра народных рамёстваў і мастацтваў “Задзвінне” (г. Віцебск).



Репозиторий ВГУ

6. Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь (г. Мінск).

7. Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь (г. Мінск).

8. Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны (г. Мінск).

9. Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа (г. Мінск).

10. Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы (г. Мінск).

11. Літаратурны музей Максіма Багдановіча (г. Мінск).

12. Дом-музей Ваньковічаў (г. Мінск).

13. Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора (г. Полацк).

14. Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я (г. Полацк).

15. Стацыянарная выстава "Прагулка па Ніжне-Пакроўскай" (г. Полацк).

16. Дзіцячы музей (г. Полацк).

17. Прыродна-экалагічны музей (г. Полацк).

18. Полацкі краязнаўчы музей.

19. Музей беларускага кнігадрукавання (г. Полацк).

20. Аршанскі этнаграфічны музей "Млын".

21. Мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза К. Заслонава (г. Орша).

22. Музей гісторыі і культуры г. Орша.

23. Аршанскі музей У.С. Караткевіча.

Акрамя дзённіка і індывідуальнага задання студэнт павінен падрыхтаваць справаздачу па практыцы (прыклад афармлення і напісання глядзіце ў Дадатку 4.4). У справаздачы пазначаецца тэрмін праходжання практыкі, коратка характарызуюцца базы практыкі, вызначаюцца станоўчыя і адмоўныя моманты ў арганізацыі і правядзенні практыкі, даюцца рэкамендацыі па ўдасканаленню яе арганізацыі з абгрунтаваннем сваёй пазіцыі.

Репозиторий ВГУ

## ДАДАТКІ

**Дадатак 1**

## АБ МУЗЕЯХ І МУЗЕЙНЫМ ФОНДЗЕ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ. ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Ад 12 снежня 2005 г. № 70-З
(са зменамі і дапаўненнямі па стане на сакавік 2010 г.)

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 16 лістапада 2005 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 24 лістапада 2005 года

### *ГЛАВА 1*
### *АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ*

*Артыкул 1. Асноўныя тэрміны і іх азначэнні, якія выкарыстоўваюцца ў гэтым Законе*

У гэтым Законе выкарыстоўваюцца наступныя асноўныя тэрміны і іх азначэнні:

музей – юрыдычная асоба або структурнае падраздзяленне юрыдычнай асобы, якія рэалізуюць большасць відаў музейнай дзейнасці;

музейны прадмет – культурная каштоўнасць або выдзелены з навакольнага асяроддзя ў выніку навуковай дзейнасці унікальны прыродны аб'ект, якія маюць культурную, гістарычную, навуковую і (або) мастацкую вартасць і ўключаны ў музейны фонд у мэтах захавання, вывучэння і папулярызацыі;

музейная калекцыя – сукупнасць музейных прадметаў, аб'яднаных адной або некалькімі прыкметамі, якая з'яўляецца адным цэлым і адначасова састаўной часткай музейнага фонду;

музейны фонд – навукова абгрунтаваная сукупнасць музейных прадметаў і (або) музейных калекцый, якія захоўваюцца ў музеі;

прадмет музейнага значэння – культурная каштоўнасць або выдзелены з навакольнага асяроддзя ў выніку навуковай дзейнасці унікальны прыродны аб'ект, якія маюць прыкметы музейнага прадмета, але не ўключаны ў музейны фонд;

музейная справа – сфера культуры, якая ўключае ў сябе навуковыя, даследчыя і асветніцкія працэсы, накіраваныя на выяўленне, камплектаванне, улік, захаванне, вывучэнне і папулярызацыю культурных каштоўнасцей і (або) выдзеленых з

Рэпазіторый ВГУ

навакольнага асяроддзя ў выніку навуковай дзейнасці унікальных прыродных аб’ектаў;

музейны работнік – фізічная асоба, якая на падставе працоўнага дагавора забяспечвае ажыццяўленне ў музеі музейнай дзейнасці.

*Артыкул 2. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь*

1. Заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь грунтуецца на Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь і складаецца з Закона Рэспублікі Беларусь ад 4 чэрвеня 1991 года «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», гэтага Закона і іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

2. Калі міжнародным дагаворам Рэспублікі Беларусь устаноўлены іншыя правілы, чым тыя, якія прадугледжаны гэтым Законам, то прымяняюцца правілы міжнароднага дагавора.

*Артыкул 3. Дзяржаўнае рэгуляванне ў сферы музейнай справы*

1. Дзяржаўнае рэгуляванне ў сферы музейнай справы ажыццяўляюць Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы, іншыя дзяржаўныя органы ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй.

2. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь вызначае дзяржаўную палітыку ў сферы музейнай справы.

3. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь забяспечвае рэалізацыю дзяржаўнай палітыкі ў сферы музейнай справы.

4. Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь рэалізуе дзяржаўную палітыку ў сферы музейнай справы, ажыццяўляе рэгуляванне і кіраванне ў гэтай сферы і каардынуе дзейнасць у сферы музейнай справы іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання.

5. Мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы ў межах сваёй кампетэнцыі вырашаюць пытанні мясцовага значэння ў сферы музейнай справы.

*Артыкул 4. Асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі ў сферы музейнай справы*

Асноўнымі напрамкамі дзяржаўнай палітыкі ў сферы музейнай справы з’яўляюцца:

забеспячэнне агульнадаступнасці музейных прадметаў і музейных калекцый;

забеспячэнне сацыяльна-эканамічных і іншых умоў для эфектыўнай дзейнасці музеяў, садзейнічанне фарміраванню сучаснай інфраструктуры і інфарматызацыі музейнай справы;

падтрымка дзяржаўных праграм развіцця музейнай справы;

Рэпазіторый ВГУ

забеспячэнне захаванасці Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь, у тым ліку шляхам фінансавання кансервацыі і (або) рэстаўрацыі музейных прадметаў і музейных калекцый за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

забеспячэнне падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі музейных работнікаў;

распрацоўка, прыняцце (выданне) актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь у сферы музейнай справы і кантроль за іх выкананнем;

падтрымка фундаментальных і прыкладных навуковых даследаванняў у сферы музейнай справы;

садзейнічанне міжнароднаму супрацоўніцтву ў сферы музейнай справы, у тым ліку арганізацыя міжнародных музейных выставак у Рэспубліцы Беларусь і выставак, створаных на аснове музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, за межамі Рэспублікі Беларусь, фінансаванне ўдзелу ў міжнародных музейных арганізацыях.

*Артыкул 5. Правы і абавязкі наведвальнікаў музеяў*

1. Наведвальнікі музеяў маюць права на:

1.1. наведванне музеяў у адпаведнасці з рэжымам іх работы, а таксама карыстанне іх паслугамі;

1.2. атрыманне поўнай, дакладнай і своечасовай інфармацыі аб дзейнасці музеяў, за выключэннем інфармацыі, якая з'яўляецца дзяржаўнай або іншай ахоўваемай законам тайнай;

1.3. працу з музейнымі прадметамі і (або) музейнымі калекцыямі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

1.4. абскарджанне ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь незаконных дзеянняў (бяздзейнасці) службовых асоб музеяў, якія абмяжоўваюць правы наведвальнікаў.

2. Музеі, якія поўнасцю або часткова фінансуюцца за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў, прадастаўляюць грамадзянам права бясплатнага наведвання экспазіцый і выставак, створаных на аснове ўласных музейных фондаў, не радзей чым адзін раз у месяц, а інвалідам, ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, ваеннаслужачым тэрміновай ваеннай службы, дзецям да сямі гадоў, дзецям-сіротам, дзецям, якія засталіся без апекі бацькоў, асобам з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, навучэнцам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, музейным работнікам – пастаянна.

Навучэнцам агульнаадукацыйных устаноў, устаноў, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй



Репозиторий ВГУ

спецыяльнай і вышэйшай адукацыі, прадастаўляецца права на не больш чым 50-працэнтную скідку ад кошту ўваходнага білета для наведвання экспазіцый і выставак, створаных музеямі, указанымі ў частцы першай гэтага пункта, на аснове ўласных музейных фондаў.

Прадугледжанае часткамі першай і другой гэтага пункта прадастаўленне права бясплатнага (ільготнага) наведвання экспазіцый і выставак, створаных на аснове ўласных музейных фондаў, не распаўсюджваецца на іншыя платныя паслугі музеяў.

3. У музеях, не ўказаных у частцы першай пункта 2 гэтага артыкула, прадастаўленне права бясплатнага (ільготнага) наведвання экспазіцый і выставак, створаных на аснове ўласных музейных фондаў, вызначаецца заснавальнікамі гэтых музеяў.

4. Наведвальнікі музеяў абавязаны беражліва адносіцца да музейных прадметаў і музейных калекцый і выконваць правілы для наведвальнікаў музеяў.

*Артыкул 6. Міжнародныя сувязі музеяў*

Музеі Рэспублікі Беларусь удзельнічаюць у міжнародным супрацоўніцтве ў сферы музейнай справы ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь» і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь, а таксама міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

*Артыкул 7. Адказнасць за парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь*

За парушэнне заканадаўства Рэспублікі Беларусь аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь настае адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## *ГЛАВА 2*
## *МУЗЕІ І АРГАНІЗАЦЫЯ ІХ ДЗЕЙНАСЦІ*

*Артыкул 8. Віды музеяў па форме ўласнасці*

1. Музеі ў Рэспубліцы Беларусь падзяляюцца па форме ўласнасці на дзяржаўныя і прыватныя.

2. Да дзяржаўных музеяў адносяцца музеі, створаныя дзяржаўнымі органамі і іншымі дзяржаўнымі арганізацыямі.

3. Да прыватных музеяў адносяцца музеі, створаныя фізічнымі асобамі або недзяржаўнымі арганізацыямі.

*Артыкул 9. Статус музеяў*

1. Музеі з’яўляюцца некамерцыйнымі арганізацыямі, якія ствараюцца ў форме ўстаноў культуры.

Музеі могуць уваходзіць у склад юрыдычных асоб у якасці структурных падраздзяленняў, у тым ліку адасобленых.

Репозиторий ВГУ

2. Статус музеяў вызначаецца іх заснавальнікамі з улікам палажэнняў гэтага Закона, іншых актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь і ўказваецца ў статуце юрыдычнай асобы (далей – статут музея) або ў палажэнні аб структурным падраздзяленні юрыдычнай асобы.

3. У адпаведнасці з гэтым Законам Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь могуць устанаўліваць асаблівасці прававога становішча некаторых музеяў.

*Артыкул 10. Парадак стварэння і ліквідацыі музеяў*

1. Музеі ствараюцца і ліквідуюцца ў парадку, устаноўленым Грамадзянскім кодэксам Рэспублікі Беларусь, Законам Рэспублікі Беларусь «Аб культуры ў Рэспубліцы Беларусь», гэтым Законам і іншымі актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

2. Стварэнне дзяржаўных музеяў ажыццяўляецца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, а таксама іншымі дзяржаўнымі органамі і дзяржаўнымі арганізацыямі па ўзгадненню з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.

3. Абавязковымі ўмовамі для стварэння музея з'яўляюцца:

3.1. наяўнасць культурных каштоўнасцей і (або) выдзеленых з навакольнага асяроддзя ў выніку навуковай дзейнасці унікальных прыродных аб'ектаў, а таксама навуковага праекта музея, у залежнасці ад якіх вызначаецца профіль музея;

3.2. магчымасць заснавальніка музея забяспечыць музей будынкам (памяшканнем), які адпавядае профілю музея і патрабаванням па захоўванню музейных прадметаў і музейных калекцый, а таксама неабходнымі фінансавымі сродкамі для арганізацыі і ажыццяўлення музейнай дзейнасці;

3.3. іншыя ўмовы, прадугледжаныя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

4. Пры ліквідацыі дзяржаўнага музея яго музейны фонд перадаецца іншым дзяржаўным музеям.

Пры ліквідацыі прыватнага музея яго заснавальнік абавязаны забяспечыць цэласнасць і захаванасць музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь.

Пры ліквідацыі прыватнага музея ў выпадку прыняцця ўласнікам музейных прадметаў і (або) музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, рашэння аб іх адчужэнні перавагу ў набыцці гэтых музейных прадметаў і (або) музейных калекцый пры іншых роўных умовах маюць дзяржаўныя органы і дзяржаўныя музеі.

Рэпазіторый ВГУ

*Артыкул 11. Асноўныя задачы музеяў*

Асноўнымі задачамі музеяў з'яўляюцца выяўленне, камплектаванне, улік, захаванне, вывучэнне і папулярызацыя культурных каштоўнасцей і (або) выдзеленых з навакольнага асяроддзя ў выніку навуковай дзейнасці унікальных прыродных аб'ектаў у мэтах забеспячэння агульнадаступнасці культурных каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, выкарыстання іх для інтэлектуальнага і культурнага развіцця грамадства, у тым ліку для распаўсюджвання ведаў аб навакольным асяроддзі, гісторыі і культуры.

*Артыкул 12. Музейная дзейнасць*

1. Музейная дзейнасць ажыццяўляецца музеямі і ўключае ў сябе наступныя віды:

1.1. выяўленне прадметаў музейнага значэння;

1.2. камплектаванне музейных фондаў;

1.3. улік музейных прадметаў і музейных калекцый;

1.4. захоўванне музейных прадметаў і музейных калекцый, забеспячэнне іх цэласнасці і захаванасці;

1.5. вывучэнне музейных прадметаў і музейных калекцый, у тым ліку правядзенне на іх аснове навуковых даследаванняў архіўных, бібліятэчных і іншых крыніц;

1.6. навуковую інвентарызацыю і каталагізацыю музейных прадметаў і музейных калекцый;

1.7. навуковае і мастацкае праектаванне, стварэнне на аснове музейных фондаў экспазіцый і выставак;

1.8. экскурсійнае абслугоўванне наведвальнікаў музеяў;

1.9. культурна-асветніцкую дзейнасць, звязаную з музейнымі прадметамі і музейнымі калекцыямі;

1.10. папулярызацыю музейных прадметаў і музейных калекцый, у тым ліку шляхам публічнага іх прадстаўлення, публікацыі адпаведных матэрыялаў;

1.11. правядзенне навукова-практычных семінараў і канферэнцый, іншых мерапрыемстваў у сферы музейнай справы;

1.12. кансервацыю і рэстаўрацыю музейных прадметаў і музейных калекцый.

2. Юрыдычныя асобы, якія не з'яўляюцца музеямі, а таксама фізічныя асобы могуць рэалізоўваць асобныя віды музейнай дзейнасці.

*Артыкул 13. Экспазіцыі і выстаўкі музеяў*

1. У музеях на аснове ўласных музейных фондаў ствараюцца пастаянныя і часовыя экспазіцыі і выстаўкі.

2. Парадак стварэння і адкрыцця экспазіцый і выставак музеяў устанаўліваецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь.



Репозиторий ВГУ

*Артыкул 14. Правы і абавязкі музеяў*

1. Музеі маюць права на:

1.1. дакументаванне ўсіх з'яў айчыннай і замежнай гісторыі і культуры незалежна ад іх палітычнай, ідэалагічнай, гаспадарчай, сацыяльнай або іншай накіраванасці, за выключэннем з'яў, звесткі аб якіх з'яўляюцца дзяржаўнай або іншай ахоўваемай законам тайнай;

1.2. арганізацыю і правядзенне навукова-даследчых экспедыцый для забеспячэння камплектавання музейных фондаў, а таксама на выяўленне прадметаў музейнага значэння іншым спосабам, які не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь;

1.3. ажыццяўленне ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь прадпрымальніцкай і (або) іншай дзейнасці, якая прыносіць даход, у тым ліку аказанне платных паслуг;

1.4. працу ў парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, у архівах, бібліятэках і іншых арганізацыях.

2. Музеі абавязаны:

2.1. садзейнічаць рэалізацыі правоў наведвальнікаў музеяў, прадугледжаных гэтым Законам;

2.2. абслугоўваць наведвальнікаў музеяў у адпаведнасці са статутам музея або палажэннем аб структурным падраздзяленні юрыдычнай асобы;

2.3. пашыраць доступ наведвальнікаў да музейных прадметаў і музейных калекцый;

2.4. забяспечваць цэласнасць і захаванасць музейных прадметаў і музейных калекцый;

2.5. рабіць справаздачы перад органамі дзяржаўнага кіравання ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь;

2.6. забяспечваць падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі музейных работнікаў;

2.7. прадастаўляць у адпаведнасці з гэтым Законам асобным катэгорыям грамадзян права бясплатнага (ільготнага) наведвання экспазіцый і выставак, створаных на аснове ўласных музейных фондаў;

2.8. разглядаць у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь звароты грамадзян.

## *ГЛАВА 3*
## *АСАБЛІВАСЦІ ПРАВАВОГА СТАНОВІШЧА І ПАРАДКУ ДЗЕЙНАСЦІ НЕКАТОРЫХ МУЗЕЯЎ*

*Артыкул 15. Гісторыка-культурныя музеі-запаведнікі*

1. Комплексы і ансамблі нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія маюць асаблівае культурнае, гістарычнае, навуковае і (або) мастацкае значэнне, разам з



Репозиторий ВГУ

тэрыторыяй, гістарычна і культурна звязанай з імі, па прадстаўленню Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, а таксама па прадстаўленнях іншых рэспубліканскіх органаў дзяржаўнага кіравання, абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, узгодненых з Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь, ва ўстаноўленым парадку могуць быць аб’яўлены Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь або па яго даручэнню Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь гісторыка-культурнымі музеямі-запаведнікамі.

2. Межы гісторыка-культурных музеяў-запаведнікаў, асаблівасці іх прававога становішча, аховы і выкарыстання вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь, калі іншае не ўстаноўлена Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

3. Ахова нерухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей, якія ўваходзяць у склад гісторыка-культурных музеяў-запаведнікаў, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны.

*Артыкул 16. Нацыянальныя музеі*

1. Музеям, зарэгістраваным як юрыдычныя асобы, маёмасць якіх знаходзіцца ў рэспубліканскай уласнасці, можа быць прысвоены статус «нацыянальны» пры ўмове ўнясення імі значнага ўкладу ў развіццё музейнай справы Рэспублікі Беларусь.

2. Парадак прысваення, перыядычнага пацвярджэння, пазбаўлення статусу «нацыянальны» і асаблівасці прававога становішча музея з такім статусам вызначаюцца Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

*Артыкул 17. Народныя музеі*

1. Музеям, якія ўваходзяць у склад юрыдычнай асобы ў якасці структурных падраздзяленняў, можа быць прысвоены статус «народны» пры ўмове ажыццяўлення імі на адпаведным прафесійным узроўні музейнай дзейнасці не менш чым дзесяць гадоў.

2. Парадак прысваення, перыядычнага пацвярджэння, пазбаўлення статусу «народны» і асаблівасці прававога становішча музея з такім статусам вызначаюцца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 4
## КАМПЛЕКТАВАННЕ МУЗЕЙНЫХ ФОНДАЎ. МУЗЕЙНЫЯ ПРАДМЕТЫ І МУЗЕЙНЫЯ КАЛЕКЦЫІ

*Артыкул 18. Камплектаванне музейных фондаў*

1. Камплектаванне музейных фондаў ажыццяўляецца шляхам:

1.1. набыцця прадметаў музейнага значэння;

1.2. дарэння музеям прадметаў музейнага значэння;

Рэпазіторый ВГУ

1.3. абмену ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь музейнымі прадметамі або прадметамі музейнага значэння, музейнымі калекцыямі;

1.4. іншымі спосабамі, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

2. Прадметы музейнага значэння, накіраваныя (перададзеныя) ва ўласнасць дзяржавы, перадаюцца дзяржаўным музеям у парадку, устаноўленым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

*Артыкул 19. Асаблівасці выкарыстання і захоўвання музейных прадметаў і музейных калекцый, распараджэння імі*

1. Музейныя прадметы і музейныя калекцыі ў працэсе музейнай дзейнасці выкарыстоўваюцца ў мэтах забеспячэння агульнадаступнасці культурных каштоўнасцей айчыннай і сусветнай культуры, выкарыстання іх для інтэлектуальнага і культурнага развіцця грамадства, у тым ліку для распаўсюджвання ведаў аб навакольным асяроддзі, гісторыі і культуры.

2. Забараняецца выкарыстанне музейных прадметаў і музейных калекцый ва ўмовах, якія ствараюць пагрозу іх захаванню і (або) могуць прывесці да іх пашкоджання, страты ці знішчэння. У мэтах забеспячэння захавання музейных прадметаў і музейных калекцый і выключэння выпадкаў іх пашкоджання, страты ці знішчэння ў музеях устанаўліваецца навукова абгрунтаваны спецыяльны рэжым захоўвання музейных прадметаў і музейных калекцый, праводзяцца іх кансервацыя і (або) рэстаўрацыя.

3. Музейныя прадметы і музейныя калекцыі, уключаныя ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, вывазу за межы Рэспублікі Беларусь на пастаяннае захоўванне не падлягаюць, за выключэннем выпадкаў, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Часовы вываз музейных прадметаў і музейных калекцый за межы Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

4. Парадак перадачы музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, на часовае або пастаяннае захоўванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь устанаўліваецца Палажэннем аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь.

Асаблівасці выкарыстання музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у культурна-гістарычны фонд Дзяржаўнага фонду каштоўных металаў і каштоўных камянёў Рэспублікі Беларусь, устанаўліваюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сферы дзейнасці з каштоўнымі металамі і каштоўнымі камянямі.

Рэпазіторый ВГУ

5. Выраб выяўленчай, друкаванай, сувенірнай і іншай тыражаванай прадукцыі і вытворчасць тавараў народнага спажывання з выкарыстаннем выяў музейных прадметаў і музейных калекцый, будынкаў музеяў, аб’ектаў, размешчаных на тэрыторыях музеяў, у тым ліку з выкарыстаннем іх назваў і сімволікі, ажыццяўляюцца толькі з дазволу музеяў.

*Артыкул 20. Права ўласнасці на музейныя прадметы і музейныя калекцыі*

Музейныя прадметы і музейныя калекцыі могуць знаходзіцца ў дзяржаўнай або прыватнай уласнасці, за выключэннем аб’ектаў, якія ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь знаходзяцца толькі ва ўласнасці дзяржавы.

## *ГЛАВА 5*
## *МУЗЕЙНЫ ФОНД РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ*

*Артыкул 21. Агульныя палажэнні аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь*

1. Музейны фонд Рэспублікі Беларусь уяўляе сабой сукупнасць музейных фондаў дзяржаўных музеяў і асобных музейных прадметаў і музейных калекцый прыватных музеяў, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з часткай другой пункта 1 артыкула 22 гэтага Закона.

2. Музейныя прадметы і музейныя калекцыі, уключаныя ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, з’яўляюцца неад’емнай часткай культурнай спадчыны Рэспублікі Беларусь.

3. Палажэнне аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь зацвярджаецца Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь.

*Артыкул 22. Уключэнне музейных прадметаў і музейных калекцый у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь і іх выключэнне з Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь*

1. Парадак уключэння музейных прадметаў і музейных калекцый у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь і іх выключэння з Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь устанаўліваецца Палажэннем аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь.

Музейныя прадметы і музейныя калекцыі прыватных музеяў уключаюцца ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь на падставе пісьмова афармленых заяў або згоды ўласнікаў гэтых музейных прадметаў і музейных калекцый.

2. Музейны прадмет і музейная калекцыя выключаюцца з Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь, калі яны:

2.1. пашкоджаны ў такой ступені, што немагчыма іх рэстаўрыраваць;

Рэпазіторый ВДУ

2.2. страцілі сваю культурную, гістарычную, навуковую і (або) мастацкую вартасць;

2.3. страчаны ці знішчаны ў выніку ўздзеяння прыродных фактараў;

2.4. выкрадзены, што пацвярджаецца адпаведнымі дзяржаўнымі органамі;

2.5. знаходзяцца ў музейным фондзе прыватнага музея (на падставе пісьмова афармленых заяў уласнікаў гэтых музейных прадметаў і музейных калекцый);

2.6. абменьваюцца згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь адпаведна на іншы музейны прадмет, які знаходзіцца ў замежным музеі, або прадмет музейнага значэння, і на іншую музейную калекцыю, якая знаходзіцца ў замежным музеі.

3. Музейнаму прадмету і музейнай калекцыі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны можа быць нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці.

*Артыкул 23. Цэнтралізаваны ўлік музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь*

1. Музейныя прадметы і музейныя калекцыі, уключаныя ў Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, падлягаюць цэнтралізаванаму ўліку.

2. Цэнтралізаваны ўлік музейных прадметаў і музейных калекцый ажыццяўляецца Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь праз вядзенне Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь, у якім змяшчаюцца асноўныя звесткі аб кожным музейным прадмеце і кожнай музейнай калекцыі, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь.

3. Уласнікі музейных прадметаў і музейных калекцый, уключаных у Музейны фонд Рэспублікі Беларусь, абавязаны забяспечыць прадстаўленне ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь дакладнай інфармацыі аб гэтых музейных прадметах і музейных калекцыях для ўнясення яе ў Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь.

4. Парадак вядзення Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь і парадак прадстаўлення ў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь інфармацыі для ўнясення яе ў Дзяржаўны каталог Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь устанаўліваюцца Палажэннем аб Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь.

*Артыкул 24. Дзяржаўны кантроль за станам Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь*

1. Дзяржаўны кантроль за станам Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца Міністэрствам культуры Рэспублікі



Рэпазіторый ВДУ

Беларусь, мясцовымі выканаўчымі і распарадчымі органамі, іншымі дзяржаўнымі органамі ў адпаведнасці з іх кампетэнцыяй.

2. Дзяржаўны кантроль за станам Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь ажыццяўляецца ў формах:

2.1. праверкі цэласнасці і захаванасці музейных прадметаў і музейных калекцый;

2.2. праверкі ўліковых дакументаў музейных прадметаў і музейных калекцый;

2.3. у іншых формах, устаноўленых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

3. Парадак ажыццяўлення дзяржаўнага кантролю за станам Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь устанаўліваецца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## *ГЛАВА 6*
## *МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ І ФІНАНСАВАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ МУЗЕЯЎ*

*Артыкул 25. Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне музеяў*

1. Заснавальнік музея павінен забяспечыць музей будынкам (памяшканнем), які адпавядае профілю музея і патрабаванням па захоўванню музейных прадметаў і музейных калекцый, а таксама абсталяваннем і фінансавымі, тэхнічнымі і іншымі сродкамі, неабходнымі для ажыццяўлення музейнай дзейнасці.

2. Размяшчэнне музеяў у будынках (памяшканнях), якія не адпавядаюць патрабаванням па захоўванню музейных прадметаў і музейных калекцый, і перавод музеяў у будынкі (памяшканні), якія пагаршаюць умовы іх дзейнасці, не дапускаюцца.

3. У выпадку перадачы іншым арганізацыям будынка (памяшкання), у якім размешчаны дзяржаўны музей, дзяржаўныя органы, якія ажыццяўляюць перадачу, прадастаўляюць дзяржаўнаму музею раўнацэнны будынак (памяшканне) і забяспечваюць за свой кошт перамяшчэнне музейнага фонду і абсталявання музея.

*Артыкул 26. Фінансаванне музеяў*

Фінансаванне музеяў ажыццяўляецца за кошт:

сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў (для дзяржаўных музеяў);

сродкаў заснавальніка (для прыватных музеяў);

прыбытку ад прадпрымальніцкай і іншай дзейнасці музеяў, якая прыносіць даход, у тым ліку сродкаў, атрыманых ад продажу білетаў, экскурсійнага абслугоўвання, выставачнай дзейнасці, вырабу і рэалізацыі выяўленчай, друкаванай, сувенірнай і іншай тыражаванай



Рэпазіторый ВДУ

прадукцыі, іншых відаў паслуг, аказанне якіх не супярэчыць заканадаўству Рэспублікі Беларусь;

ахвяраванняў музеям;

іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

## *ГЛАВА 7*
## *ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ*

*Артыкул 27. Уступленне ў сілу гэтага Закона*

Гэты Закон уступае ў сілу праз шэсць месяцаў пасля яго афіцыйнага апублікавання, за выключэннем гэтага артыкула і артыкула 28, якія ўступаюць у сілу з дня афіцыйнага апублікавання гэтага Закона.

*Артыкул 28. Прывядзенне актаў заканадаўства Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам*

Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь у шасцімесячны тэрмін пасля афіцыйнага апублікавання гэтага Закона:

прывесці нарматыўныя прававыя акты Урада Рэспублікі Беларусь у адпаведнасць з гэтым Законам;

забяспечыць перагляд і адмену рэспубліканскімі органамі дзяржаўнага кіравання, падпарадкаванымі Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, іх нарматыўных прававых актаў, якія супярэчаць гэтаму Закону;

прыняць іншыя меры, неабходныя для рэалізацыі палажэнняў гэтага Закона.

*Артыкул 29. Прызнанне заканадаўчага акта Рэспублікі Беларусь страціўшым сілу*

У сувязі з прыняццем гэтага Закона прызнаць страціўшым сілу Закон Рэспублікі Беларусь ад 5 верасня 1996 года «Аб музеях і Музейным фондзе Рэспублікі Беларусь» (Ведамасці Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, 1996 г., № 28, арт. 512).

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р. Лукашэнка

Репозиторий ВГУ

**Дадатак 2**

# ПАЛАЖЭННЕ АБ АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННІ МУЗЕЙНАЙ (АЗНАЯМЛЯЛЬНАЙ) ПРАКТЫКІ НА ГІСТАРЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

## I. Агульныя палажэнні

1. Музейная (азнаямляльная) практыка з'яўляецца неад'емнай часткай падрыхтоўкі студэнтаў спецыяльнасці 1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны па накірунках. Накірунак спецыяльнасці: 1-23 01 12-04 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм).

2. Змест музейнай (азнаямляльнай) практыкі вызначаецца вучэбнай праграмай, распрацаванай кафедрай гісторыі Беларусі і зацверджанай рэктарам універсітэта.

3. Правядзенне музейнай (азнаямляльнай) практыкі ажыццяўляецца на аснове дзеючых нарматыўна-прававых актаў Рэспублікі Беларусь, агульнауніверсітэцкага Палажэння аб практыцы студэнтаў Установы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава" і дадзенага палажэння.

4. Практыка праводзіцца ў тэрміны, прадугледжаныя дзеючымі вучэбнымі планамі спецыяльнасці, графікам вучэбнага працэсу і афармляецца загадам рэктара універсітэта.

## II. Мэта і задачы музейна-азнаямляльнай практыкі

5. Мэтай музейнай (азнаямляльнай) практыкі выступае падрыхтоўка высокакваліфікаваных спецыялістаў праз непасрэднае азнаямленне студэнтаў з сучаснай музейнай сеткай Рэспублікі Беларусь, фарміраванне ў будучых спецыялістаў уяўлення пра асноўныя накірункі работы сучасных музеяў розных профіляў.

6. Асноўнымі задачамі музейнай (азнаямляльнай) практыкі з'яўляюцца:

6.1. паглыбленне і замацаванне тэарэтычных ведаў, набытых ў рамках вывучэння курсаў па спецыяльнасці;

6.2. азнаямленне з вядучымі музеямі і музейнай сеткай Рэспублікі Беларусь і Віцебскай вобласці;

6.3. фарміраванне агульных уяўленняў пра экспазіцыі і калекцыі сучасных музеяў, выпрацоўка ведаў пра асноўныя тыпы і профілі музеяў з мэтай глыбокага разумення лекцыйных курсаў, што будуць чытацца пры далейшым навучанні па спецыяльнасці;



Репозиторий ВГУ

6.4. развіццё аналітычных навыкаў і крытычнага мыслення;

6.5. выхаванне пачуцця патрыятызму і паважлівага стаўлення да гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

## III. Арганізацыя і правядзенне музейнай (азнаямляльнай) практыкі

7. Музейная (азнаямляльная) практыка складаецца з дзвюх частак:

7.1. першая праводзіцца ў г. Віцебску і прадугледжвае азнаямленне з дзеючай музейнай сеткай горада;

7.2. другая (выязная) прадугледжвае знаёмства студэнтаў з найбольш вядомымі музеямі вобласці і рэспублікі.

8. Перад пачаткам практыкі праводзіцца ўстановачная канферэнцыя, падчас якой студэнты знаёмяцца з загадам, праграмай і графікам праходжання практыкі, да студэнтаў даводзяцца іх правы і абавязкі, агульныя патрабаванні да дакументацыі, якую неабходна прадставіць па выніках практыкі, праводзіцца інструктаж па тэхніцы бяспекі.

9. Агульная арганізацыя і кіраўніцтва практыкай здзяйсняецца факультэцкім кіраўніком практыкі, прызначаным загадам рэктара універсітэта з ліку найбольш дасведчаных і вопытных выкладчыкаў.

10. Падставай для правядзення практыкі з’яўляецца загад рэктара. Праект загада рыхтуецца дэканатам (факультэцкім кіраўніком практыкі), які падаецца кіраўніку практыкамі універсітэта не пазней, чым за 2 тыдні да пачатку практыкі.

11. Кіраўнік практыкамі універсітэта і адпаведныя падраздзяленні (агульны аддзел, упраўленне бухгалтарскага ўліку і фінансаў, адміністрацыйна-гаспадарчая частка) забяспечваюць своечасовае афармленне вызначанай дакументацыі, фінансаванне і выезд студэнтаў на практыку.

12. Выкладчыкам і студэнтам, якія выязджаюць на вучэбную практыку, аплата праезду, сутачных і кватэрных выдаткаў ажыццяўляецца ў парадку, устаноўленым дзеючымі інструктыўнымі дакументамі.

13. Вучэбна-метадычнае кіраўніцтва практыкай і выкананне вучэбных планаў забяспечвае кафедра гісторыі Беларусі.

14. Адказнасць за арганізацыю і правядзенне практыкі, а таксама кантроль за яе правядзеннем ускладаецца на дэкана гістарычнага факультэта, загадчыка кафедры гісторыі Беларусі і кіраўніка практык універсітэта.

## IV. Правы і абавязкі студэнтаў

15. Студэнты ў перыяд правядзення практыкі маюць права:

15.1. па ўсіх пытаннях, якія ўзнікаюць у працэсе практыкі, звяртацца да кіраўнікоў практыкі;



Репозиторий ВГУ

15.2. уносіць прапановы ў пісьмовай форме па ўдасканаленні працэсу арганізацыі практыкі.

16. Студэнты ў перыяд правядзення практыкі абавязаны:

16.1. выконваць у вызначаныя тэрміны ўсе віды заданняў і работ, прадугледжаных праграмай практыкі;

16.2. штодзённа весці дзённік практыкі і прадстаўляць яго кіраўніку для праверкі;

16.3. выконваць правілы тэхнікі бяспекі па месцы праходжання практыкі;

16.4. падпарадкоўвацца правілам унутранага распарадку, выконваць распараджэнні кіраўніка практыкі і групавых кіраўнікоў-метадыстаў;

16.5. у вызначаныя тэрміны здаць залік па практыцы.

## V. Абавязкі факультэцкага кіраўніка практыкі

17. Факультэцкі кіраўнік практыкі:

17.1. распрацоўвае і прадстаўляе на зацвярджэнне загад і графік праходжання студэнтамі практыкі;

17.2. у час правядзення практыкі адказвае за выкананне загаду рэктара і пры неабходнасці робіць прапановы пра ўнясенне ў загад і графік практыкі змяненняў і дапаўненняў;

17.3. кантралюе выкананне абавязкаў студэнтамі і групавымі кіраўнікамі-метадыстамі, адказвае за стан тэхнікі бяспекі;

17.4. прымае справаздачную дакументацыю і выстаўляе залік па практыцы ў апошні дзень яе правядзення;

17.5. пасля завяршэння практыкі прадстаўляе ў дэканат і на кафедру, адказную за правядзенне практыкі, агульную справаздачу аб выніках вучэбнай практыкі.

## VI. Абавязкі групавых кіраўнікоў-метадыстаў

18. Групавы кіраўнік-метадыст:

18.1. ажыццяўляе кантроль за дзейнасцю замацаванай за ім групы студэнтаў;

18.2. сочыць за выкананнем студэнтамі вучэбнай праграмы і графіку праходжання практыкі, аказвае метадычную дапамогу;

18.3. арганізуе і кантралюе адпрацоўку прапушчаных студэнтамі заняткаў;

18.4. правярае справаздачную дакументацыю і прадстаўляе факультэцкаму кіраўніку інфармацыю па правядзенні практыкі ў групе для складання агульнай справаздачы;

18.5. выконвае распараджэнні факультэцкага кіраўніка практыкі.

Репозиторий ВГУ

**Дадатак 3**

# МУЗЕІ БЕЛАРУСІ, РЭКАМЕНДАВАНЫЯ ДЛЯ НАВЕДВАННЯ ПАДЧАС ПРАХОДЖАННЯ ПРАКТЫКІ

## Віцебск

***Віцебскі абласны краязнаўчы музей*** *(ВАКМ)*
г. Віцебск, вул. Леніна, 36.Тэл.: 36-47-12; 36-05-87.
Сайт: www.ratusha.by

***Філіялы ВАКМ:***
1. ***Віцебскі мастацкі музей***
г. Віцебск, вул. Леніна, 32. Тэл. 36-31-45

2. ***Віцебскі літаратурны музей***
г. Віцебск, пр-т Фрунзе, 13. Тэл. 37-05-89

3. ***Музей прыватных калекцый***
г. Віцебск, вул. Даватара, 26. Тэл. 36-22-69

4. ***Музей-сядзіба І. Я. Рэпіна “Здраўнёва”***
Віцебскі р-н, пас. Руба. Праезд на гарадскім аўтобусе № 26-а.
Тэл. 29-16-73

***Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза М.П. Шмырова***
г. Віцебск, вул. Чэхава, 4. Тэл. 36-69-54

***Віцебскі музей воінаў-інтэрнацыяналістаў***
г. Віцебск, вул. Воінаў-інтэрнацыяналістаў, 20. Тэл. 61-40-75

***Выставачная зала Цэнтра народных рамёстваў і мастацтваў “Задзвінне”***
г. Віцебск, вул. Чайкоўскага, 3. Тэл. 36-05-81

***Выставачная зала Цэнтра культуры “Віцебск” “Духаўскі круглік”***
г. Віцебск, пр-т Фрунзе, 11а. Тэл. 35-81-38

***Царкоўна-археалагічны кабінет Віцебскай епархіі***
г. Віцебск, вул. Крылова, 3. Тэл. 36-94-70



Репозиторий ВГУ

***Музей гісторыі віцебскага трамвая***
г. Віцебск, вул. 5-я Фрунзе, 7. Тел. 24-17-39

***Музей Віцебскага аддзялення Беларускай чыгункі***
г. Віцебск, вул. Някрасава, 2а/46. Тэл. 37-84-15

***Куток гісторыі Віцебскай мытні***
г. Віцебск, вул. Лазо, 114. Тел. 35-03-22

***Музей Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага універсітэта***
г. Віцебск, вул. Фрунзе, 27. Тел. 24-94-38

***Музей анатоміі жывёл Віцебскай акадэміі ветэрэнарнай медыцыны***
г. Віцебск, вул. 1-я Даватара, 7/11. Тел. 36-09-55

***Музей гісторыі Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага універсітэта***
г. Віцебск, Маскоўскі пр-т, 72

***Музейна-выставачная экспазіцыя Галоўнага ўпраўлення НБРБ па Віцебскай вобласці***
г. Віцебск, вул. Леніна, 17. Тел. 29-74-41

***Пажарна-тэхнічная выстава Віцебскага абласнога ўпраўлення МНС***
г. Віцебск, вул. Жасткова, 13. Тел. 47-93-24

***Музей гісторыі віцебскай энергасістэмы***
г. Віцебск, вул. "Праўды", 30.

**Мінск**

***Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь***
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тел. (017) 227-43-22
Сайт: www.history.museum.by

***Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь***
г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тел. (017) 227-71-63
Сайт: www.artmuseum.by

Репозиторий ВГУ

***Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны***
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25-а. Тэл. (017) 227-56-11
Сайт: www.war.museum.by

***Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа***
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл. 284-19-40
Сайт: www.yakubkolas.by

***Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы***
г. Мінск, вул. Я. Купалы, 4. Тэл. 227-79-43
Сайт: www.kupala-museum.by

**Полацк**

***Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік***
Сайт: www.polotsk.museum.by

1. ***Музей гісторыі архітэктуры Сафійскага сабора***
г. Полацк, вул. Замкавая, 1. Тэл. (0214) 42-53-40

2. ***Музей традыцыйнага ручнога ткацтва Паазер'я***
г. Полацк, вул. Вайкова, 1. Тэл. (0214) 42-30-41

3. ***Дзіцячы музей***
г. Полацк, вул. Ніжне-Пакроўская, 46. Тэл. (0214) 42-45-58

4. ***Прыродна-экалагічны музей***
г. Полацк, вул. Скарыны, 21. Тэл. (0214) 42-42-13

5. ***Полацкі краязнаўчы музей***
г. Полацк, вул. Ніжне-Пакроўская, 11. Тэл. (0214) 42-27-15

6. ***Полацкі музей беларускага кнігадрукавання***
г. Полацк, вул. Ніжне-Пакроўская, 22. Тэл. (0214) 42-57-25

Репозиторий ВГУ

## Орша

***Музейны комплекс гісторыі і культуры Аршанічыны***

1. ***Аршанскі этнаграфічны музей “Млын”***

г. Орша, вул. Замкавая, 2. Тел. (0216) 21-20-68

2. ***Мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза К. Заслонава***

г. Орша, вул. Молакава, 9. Тел. (0216) 20-26-33

3. ***Музей гісторыі і культуры г. Орша***

г. Орша, вул. Леніна, 9. Тел. (0216) 21-25-51

4. ***Аршанскі музей У.С. Караткевіча***

г. Орша, вул. Леніна, 26. Тел. (0216) 21-18-49

Репозиторий ВГУ

**Дадатак 4**

## УЗОРЫ АФАРМЛЕННЯ СПРАВАЗДАЧНЫХ ДАКУМЕНТАЎ ПРАКТЫКІ

### 4.1. Узор афармлення тытульнага аркуша дзённіка музейнай (азнаямляльнай) практыкі

Установа адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава”
Гістарычны факультэт
Кафедра гісторыі Беларусі

Дзённік
музейнай (азнаямляльнай) практыкі

студэнта(кі)__________курса___________групы

_______________________________________________________

*прозвішча, імя, імя па бацьку*

Факультэцкі кіраўнік практыкі

________________________________

*прозвішча, імя, імя па бацьку*

Групавы кіраўнік практыкі

________________________________

*прозвішча, імя, імя па бацьку*

Віцебск, 2010 г.



Репозиторий ВГУ

## 4.2. Прыклад апісання музея ў дзённіку па ўстаноўленай схеме

<table>
<tr><th>Дата, выконваемая работа</th><th>Подпіс кіраўніка. Заўвагі</th></tr>
<tr><td>

**5.07.2009**

***Віцебскі абласны краязнаўчы музей***

**Адрас:** г. Віцебск, вул. Леніна, 36.<br>
**Тэлефон:** 36-47-12; 36-05-87.<br>
**Дырэктар музея:** Савіцкі Глеб Уладзіміравіч

Віцебскі абласны краязнаўчы музей быў заснаваны ў 1918 г. як Віцебскі губернскі музей. Размешчаны ў помніку архітэктуры XVIII ст. – гарадской ратушы. Налічвае 14 экспазіцыйных залаў і каля 200000 экспанатаў асноўнага фонду. Мае некалькі філіялаў

**Тып:** навукова-асветніцкі<br>
**Профіль:** Комплексны.<br>
Грамадскі. Дзяржаўны. Абласны.

**Найбольш цікавыя калекцыі**: археалагічная, геалагічная, біялагічная, калекцыя фотаздымкаў, зброя і вайсковы рыштунак, калекцыя тканін, друкаваных выданняў і інш.

ЭКСПАЗІЦЫІ:

Музейная экспазіцыя:<br>
"**Прырода Віцебскага краю**"

**Від экспазіцыі:** ландшафтная, агульнадаступная<br>
Экспазіцыя склалася каля 10 гадоў таму. Над ёю працаваў мастак Дундзін, кансультантамі выступілі даследчыкі Мяржвінскі, Іваноўскі і інш.<br>
Экспазіцыя складаецца з 4 раздзелаў (залаў):

1. Агульная характарыстыка прыроды Віцебшчыны
2. Мінулае
3. Сучаснасць
4. Дзейнасць чалавека і жыццё прыроды

Раздзел 1 прадстаўлены двума рэльефнымі картамі (карта Віцебскай вобласці і карта ледавікоў), калекцыяй малюскаў, грыбоў, раслін, жывёл, птушак. Тут жа прысутнічае дыярама – буры мядзведзь.

Раздзел 2 прадстаўлены палеанталагічным матэрыялам: рэшткамі маманта (біўні, косткі, зубы), вітрынамі з перыядамі развіцця зямлі, акамянеласцямі, а таксама штучна створаным разрэзам мясцовасці ля г.п. Руба, дзе ў 1986 г. былі знойдзены рэшткі маманта.

</td><td></td></tr>
</table>

Репозиторий ВГУ

| | |
|---|---|
| Раздзел 3 складаецца з дыярам, якія прадстаўляюць сабой замалёўкі куткоў прыроды Віцебшчыны па сезонах года.<br>У прыватнасці, маюцца наступныя дыярамы; “Сухадольны луг, сава, лісіца”, “Змешаны лес. Час палявання: лось і ваўкі”, “Асвейскае возера, андатра, выдра, бабёр, лебедзь, чапля”, “Барсук”, “Рысь”, “Дзікі і вожыкі” і г.д. У цэнтры залы размяшчаецца сімвалічнае дрэва жыцця.<br><br>Раздзел 4 распавядае пра дзейнасць чалавека ў прыродным асяроддзі. Асаблівая ўвага звернута на даследчыцкую дзейнасць па вывучэнні прыроды. У прыватнасці, асобная вітрына прысвечана навуковай рабоце У. Радкевіча (фотаздымкі, дакументы, пасведчанні). Таксама ў раздзеле экспазіцыі прадстаўлены розныя даследчыцкія прыборы, птушыныя кольцы і г.д.<br><br>**Высновы.** На мой погляд, гэта экспазіцыя з’яўляецца адной з самых лепшых у краязнаўчым музеі. Тут сабраны вялікі матэрыял, які дазваляе адчуць прыгажосць і веліч роднай прыроды, убачыць тое, што мы не заўважаем ў шэрай паўсядзённасці. Непаўторную атмасферу экспазіцыі надае музычны фон з галасамі птушак. Безумоўна, экспазіцыі такога плана заўсёды будуць выклікаць цікавасць розных катэгорый наведвальнікаў. Трэба адзначыць добрую працу экскурсавода, арыентаваную на спецыфічную аудыторыю (студэнты-практыканты). Экскурсавод здолела паказаць структуру і змест экспазіцыі. | |

Репозиторий ВГУ

## 4.3. Прыклад афармлення і зместу індывідуальнага задання

Установа адукацыі
"Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава"
Гістарычны факультэт

Кафедра гісторыі Беларусі

ІНДЫВІДУАЛЬНАЕ ЗАДАННЕ

**Віцебскі літаратурны музей**

студэнткі II курса 24 групы
Саўчанкі Дар'і Сяргееўны

*Факультэцкі кіраўнік практыкі:*
Дулаў Анатоль Мікалаевіч

*Групавы кіраўнік практыкі:*
Антаненка Надзея Леанідаўна

Віцебск, 2009



Репозиторий ВГУ

# ВІЦЕБСКІ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ[1]

Літаратурныя музеі з'яўляюцца адной з самых прадстаўнічых профільных груп у структуры музейнай сеткі Беларусі, што тлумачыцца асаблівым месцам літаратуры ў грамадскім жыцці краіны і гісторыі народа. Экспазіцыі літаратурных музеяў, створаных у апошнія дзесяцігоддзі, адрозніваюцца незвычайнай эмацыянальнай насычанасцю, багаццем выкарыстоўваемых вобразаў. Віцебскі літаратурны музей таксама з гэтагу шэрагу.

*Час заснавання музея, яго тып і профіль*

Музей быў заснаваны 26 лістапада 1988 года (адкрыты 14 мая 1998 года) паводле пастановы Віцебскага гарадскога выканаўчага камітэта. Тып і профіль музея можна вызначыць з дапамогай наступнай табліцы:

| | |
|---|---|
| Тып па прыкмеце грамадскага прызначэння: | *Навукова-асветніцкі (масавы)* |
| Тып адпаведна захоўваемай спадчыне | *Калекцыйны* |
| Па профілю | *Літаратурны музей шырокага профілю* |
| Па форме ўласнасці | *Дзяржаўны* |
| Статус музея | *Філіял Віцебскага абласнога краязнаўчага музея* |

Кіраўніком музея (загадчыкам філіяла) ад самага заснавання з'яўляецца Святлана Мікалаеўна Казлова.

*Размяшчэнне музея*

Музей знаходзіцца ў самым цэнтры Віцебска, на колішняй Задунаўскай вуліцы. Сённяшні яго адрас – праспект Фрунзе, 13. Большасць віцяблян, едучы на працу, бачаць музей і яго атачэнне, бо паблізу знаходзіцца самая буйная транспартная артэрыя горада – вуліца Леніна. Музей размешчаны на тым месцы, дзе праходзіла мяжа абарончага комплексу, пабудаванага пры Альгердзе, уладары Віцебскага ваяводства і вялікім князі літоўскім. Побач з музеем – такія знакавыя месцы, як пл. Свабоды, амфітэатр, рэканструяваная вежа "Духаўскі круглік". Усё наваколле – рознакаляровая культурная мазаіка, а музей – яе важны і неабходны фрагмент.

---

[1] Дадзенае індывідуальнае заданне носіць выразна творчы характар. Інфармацыя можа быць выкладзена і ў строга навуковым стылі.



Репозиторий ВГУ

*Будынак музея*

Будынак, у якім размешчаны музей, з'яўляецца помнікам прамысловага дойлідства другой паловы XIX ст. (тут знаходзілася збудаваная ў 1897 г. электрастанцыя, якая сілкавала першы ў Беларусі трамвай). Вялізныя вокны, вітражы надаюць колішняму прадпрыемству Гільёна зусім іншае гучанне: звон трамвайных колаў сціх – запанавала чароўная цішыня прыгожага пісьменства. Наўрад ці прадпрымальны бельгіец разлічваў, што ў канцы XX стагоддзя ў будынку, які быў разлічаны толькі на машыны, будуць праходзіць выставы, гучаць вершы, даклады.

Інтэр'ер і экстэр'ер будынка не страцілі сваёй прыгажосці, сваёй далікатнасці – з вуліцы ён нагадвае трамвай з мінулага, пафарбаваны ў цёплыя, ружова-персікавыя колеры. На сцяне (з боку праспекта Фрунзе) усталявана мемарыяльная дошка работы віцебскага скульптара Валерыя Магучага, прысвечаная першай электрастанцыі.

Прасторнае памяшканне пад высокім, са шклянымі ўстаўкамі, дахам, прыцішанае асвятленне ствараюць цудоўную атмасферу – атмасферу пісьменніцкага кабінета, атмасферу для разважанняў, для быцця сам-насам — менавіта ў такіх умовах ствараюцца новыя літаратурныя творы.

*Уваход у музей*

Уваход бачны з прыпынку: некалькі крокаў ад тралейбуса – і наведвальнік апынаецца на музейных прыступках з чырвонага граніту. Уваход. Вітальня, дзе часта ладзяцца камерныя імпрэзы. Добра аздоблены стэнд распавядае пра тое, чым зараз жыве музей. Жанчына, якая прадае квіткі, вітаецца, гасцінна пытаецца: "Вы да нас – у музей? На якую выставу?" Перад ёю – кошты за наведванне экспазіцый – крыху вышэйшыя, чым праезд у маршрутным таксі.

Дзверы адчыняюцца — загадкавы свет літаратуры вабіць. Кожны спасцігае яго па-свойму...

*Калекцыі музея*

Кожная з набытых музеем кніжак унікальная – і як адбітак тагачаснага літаратурнага жыцця, і як спадчына пісьменнікаў-землякоў.

Аснову калекцыі літаратурнага музея склалі рарытэты з фондаў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея. Калі стварэнне новай культурнай установы знаходзілася яшчэ на пачатковай стадыі, будучыя супрацоўнікі звярнуліся ў сродках масавай інфармацыі да грамадскасці з просьбамі пераглядзець свае хатнія архівы і асабістыя бібліятэкі: музей ахвотна набываў і набывае для сваіх фондаў рэдкія выданні, фотаздымкі, іншыя дакументы, якія тычацца гісторыі

літаратурнага жыцця Віцебшчыны. На сённяшні час запаснікі музея бесперапынна папаўняюцца новымі цікавосткамі. Сучасныя беларускія паэты і пісьменнікі лічаць вялікім гонарам тое, што Віцебскі літаратурны музей прымае іх кнігі ў свае фонды.

Дзякуючы высілкам, вялікаму прафесіяналізму і руплівай працы калектыву навукоўцаў былі сабраныя наступныя каштоўныя калекцыі:

- калекцыя старадрукаў XVI–XIX стст.;
- рэдкія дакументы (лісты знакамітых пісьменнікаў XX ст., карты, газетныя артыкулы) і фотаздымкі;
- этнаграфічная калекцыя (беларускія ручнікі; беларускі тэатр лялек – батлейка; аўтэнтычныя рэчы, сабраныя падчас этнаграфічных экспедыцый па Віцебшчыне: прадметы гаспадарчага ўжытку, мэбля, адзенне, абутак і г.д.).

Музей актыўна садзейнічае ўводу бібліяграфічных каштоўнасцяў, якімі валодае, у навуковае абарачэнне. Кожны даследчык можа звярнуцца да кіраўніка музея і атрымаць доступ да неабходнага выдання. На жаль, на сённяшні час бібліятэка не мае чытальнай залы, але сітуацыя можа змяніцца пасля доўгачаканай рэканструкцыі.

*Публічная тэрыторыя музея*

Музей клапоціцца аб тым, каб стварыць для наведвальнікаў атмасферу адпачынку, спакою, гармоніі. Публічная тэрыторыя музея – гэта сапраўдная затока цішыні і супакаення. Для бяспекі музей падключаны да цэнтральнай сігналізацыі.

*Выставы і экспазіцыі музея*

Агульная плошча экспазіцыі музея 250 м$^2$. Музей мае экспазіцыйную і выставачную залы, а таксама галерэю.

У аснове пастаяннай экспазіцыі (створана ў 1998 годзе), дзе прадстаўлена незлічоная колькасць унікальных кніг і прадметаў побыту, знаходзіцца адзінства гістарычнай эпохі, асобы пісьменніка, літаратурнага вобраза. Галоўным жа экспанатам тут з’яўляецца мастацкае слова, якое матэрыялізуецца ў аб’ёмна-прасторавых сюжэтных кампазіцыях, у дыялог уступаюць вобразы, створаныя мастаком, сапраўдныя старажытныя прадметы, элементы інтэр’еру будынка. Яны супольна ствараюць незвычайную і шматпланавую кампазіцыю.

Ключавы раздзел пастаяннай экспазіцыі носіць назву “Легенды і паданні Віцебскай зямлі”, далей размяшчаюцца экспанаты “Энцыклапедыі нячысцікаў”, “Беларускай батлейкі”, “Вандровак у мінулае”, паўстаюць “Знакамітыя постаці Віцебшчыны”.

Репозиторий ВГУ

Вандроўка ў літаратурнае мінулае перакрыжоўваецца з лёсамі беларусаў і іх Бацькаўшчыны. Кожны раздзел экспазіцыі ўводзіць нас у свет чарады стагоддзяў, знаёміць з гістарычнамі асобамі.

Старонкі гісторыі дазваляюць зазірнуць у старажытную Полаччыну, якая прадстаўляе нам імёны Еўфрасінні Полацкай, Францыска Скарыны, Сімяона Полацкага, друкаваную спадчыну: Евангелле Васіля Цяпінскага, слоўнік Памвы Бярынды.

Росквіт беларускай дзяржаўнасці акрэслены часамі Вялікага княства Літоўскага. Светаўспрыманне беларусаў тых часоў адлюстроўвае беларуская батлейка. У ёй смешны чорцік са сцэнкі «Цар Ірад» выклікае ўсмешку і маленькага, і дарослага наведвальніка.

Праз абрысы вокнаў дарожнай карэты прамільгнуць партрэты рускіх пісьменнікаў, чые шляхі пралягалі праз Віцебшчыну: А. Пушкіна, М. Гогаля, А. Грына, І. Лажэчнікава. І ў розныя бакі разляцяцца лісты пісьменнікаў – успаміны і ўражанні аб Віцебску.

Рэдкія дакументы і фатаздымкі распавядаюць пра літаратараў 1920–1930-х гг., якія сталі ахвярамі сталінскіх рэпрэсій (В. Ластоўскі, В. Дубоўка), пра пісьменнікаў, якія загінулі падчас Вялікай Айчыннай вайны (А. Гейнэ, Р. Жалязняк і іншыя). Пасляваенную літаратуру Віцебшчыны прэзентуюць Уладзімір Караткевіч і Васіль Быкаў, а таксама пісьменнікі, якія сёння жывуць у абласным цэнтры.

Такім чынам, пастаянная экспазіцыя музея грунтуецца на трох асноўных элементах: гістарычная эпоха, асоба пісьменніка, літаратурны вобраз. Гэта адзіная ў Беларусі экспазіцыя, пабудаваная вобразна-сюжэтным метадам, што найбольш падыходзіць для літаратурнага профілю музея. Экспазіцыя зладжана па прынцыпу вітража, калі розныя эпохі, падзеі, асобы сплецены ў дзівосны карунак, які стварыла гісторыя. Такая яе пабудова дае магчымасць гледачу аб’яднаць розныя матэрыялы сваімі асацыяцыямі, ведамі, дасведчанасцю. Аўтарам навуковай канцэпцыі пастаяннай экспазіцыі з’яўляецца кіраўнік музея С. Казлова.

Канцэпцыю афармлення распрацаваў мастак В. Кандрацьеў, увасобіў яго ідэю майстар В. Дзіброў. Мяне асабіста вельмі ўразіла “шматслойнасць” экспазіцыі: яна нагадвае ляльку-матрошку, чароўны куфэрак, ці нават камп’ютэрную гульню. Даведаўшыся пра гісторыю, культурную каштоўнасць аднаго з экспанатаў, наведвальнік адкрывае для сябе новы далягляд ведаў пра родны край, пераходзіць на наступны ўзровень дасведчанасці. Гэта вельмі тонкі псіхалагічны ход: кожны з нас жадае стаць героем прыгодніцкага фільму, кожны прагне спасцігаць таямніцы... Спадабаліся таксама нязбітасць і арыгінальнасць дызайнерскіх вырашэнняў, трапны падбор цытат з літаратурных твораў. Здзівіла вычарпальная інфармацыя, змешчаная ў анатацыях. На працягу года ў музеі праходзяць усемагчымыя



Репозиторий ВГУ

прэзентацыі новых кніг, творчыя сустрэчы з пісьменнікамі, літаратурныя вечары ў коле сяброў. Ладзяцца таксама і выставы. Сёння ў памяшканні музея праходзяць выстава работ дацэнта кафедры МГФ І.В. Гарбунова "Ваенна-гістарычная рэканструкцыя як від мастацтва (мініяцюра, дыярамы, касцюм, бутафорыя)", выстава-праект "Цацкі нашага дзяцінства", а таксама выстава "Таямнічая Японія".

Каб пазбегнуць пашкоджання гістарычных каштоўнасцяў і захаваць экспанаты, музей імкнецца падтрымліваць аптымальны тэмпературна-вільготнасны рэжым у залах і фондах музея. Для ачысткі паветра выкарыстоўваюць фільтры, дзейнічае цэнтральная сістэма пылавыдалення, мінімізуюцца ваганні вільготнасці і тэмпературы на працягу дня, ліквідуюцца канфліктныя ўмовы для розных тыпаў матэрыялаў калекцыі. Падчас рэканструкцыі, якая пачнецца неўзабаве, плануецца палепшыць якасць цеплаізаляцыі, кандыцыянавання, скарэктаваць рэжым асвятлення, уцяпліць падстрэшша.

*Абслугоўванне наведвальніка*

Штогод музей наведваюць каля шасці тысяч чалавек. Кожны наведвальнік – дарагі госць для музея. Для камфорту наведвальнікаў – мяккія пуфы ў галерэі. Музей заўсёды радуе сваіх гасцей цікавымі выставамі, пастаянна змяняецца, таму сюды хочацца вяртацца зноў і зноў.

Репозиторий ВГУ

**4.4. Прыклад афармлення і напісання справаздачы па выніках праходжання практыкі**

Установа адукацыі
“Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава”
Гістарычны факультэт

Кафедра гісторыі Беларусі

Справаздача
па музейнай (азнаямляльнай) практыцы

студэнткі _2_курса_24_групы

Пухавіцкай Юліі Сямёнаўны

*Факультэцкі кіраўнік практыкі*:
Дулаў Анатоль Мікалаевіч

*Групавы кіраўнік*:
Юрчак Дзяніс Валер’евіч

Віцебск, 2009



Репозиторий ВГУ

Мы праходзілі музейную (азнаямляльную) практыку ў перыяд з лютага па ліпень 2009 года[2]. Падчас яе наведалі ўсе асноўныя музеі Віцебска, а таксама шэраг ведамасных музеяў, сярод якіх найбольш цікавымі мне падаліся музей “Віцебскэнерга”, музей Віцебскага аддзялення Нацбанка Рэспублікі Беларусь і музей віцебскага трамваю. Акрамя дастаткова поўнага азнаямлення з музейнай сеткай Віцебска, у межах выязднога этапа практыкі мы наведалі найбольш цікавыя музеі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка і музейнага комлексу “Гісторыя і культура Аршаншчыны”.

Практыка дала нам шмат карысных ведаў, якія мы зможам выкарыстаць у нашай будучай прафесіі, пашырыла кругагляд. Да станоўчых бакоў практыкі можна аднесці перш за ўсё максімальна поўнае знаёмства з музеямі Віцебска. Мы вельмі падрабязна вывучалі экспазіцыйную і выставачную дзейнасць віцебскіх музеяў, пазнаёміліся з праблемамі і перспектывамі яе развіцця, спецыфікай работы экскурсавода, змаглі ацаніць яе якасць і асаблівасці. Наведванне ведамасных музеяў таксама было значным, бо удзел грамадства ў захаванні гістарычнай спадчыны падаецца нам вельмі важным, і мы пабачылі, што гэтыя музеі развіваюцца даволі плённа, некаторыя нават не саступаюць спецыяльным музейным установам.

Вельмі карысным было і наведванне музеяў Полацка і Оршы, дзякуючы якім мы пазнаёміліся са спецыфікай працы музея-запаведніка і гісторыка-культурнага комплексу, даведаліся, што іх экспазіцыі цікавыя і каштоўныя.

Да адмоўных момантаў праходжання і арганізацыі практыкі можна аднесці тое, што мы даведаліся у большай ступені пра знешні бок работы музеяў – мы разглядалі і імкнуліся аналізаваць пастаянныя экспазіцыі і часовыя выставы. Але падчас практыкі хацелася б больш даведацца і пра фарміраванне калекцый, фондаў музея, яго выдавецкую дзейнасць, работу музейных спецыялістаў, музейную педагогіку. Магчыма, гэта не ўваходзіць ў задачы дадзенай практыкі, але гэта было б карысна. Тым не менш, у некаторых музеях мы атрымалі больш поўную інфармацыю. На маю думку, пры праходжанні практыкі не трэба абмяжоўвацца напісаннем дзённіка, а імкнуцца да атрымання як мага больш ведаў.

Таксама, на жаль, практыка ўпершыню за апошнія гады праходзіла толькі на тэрыторыі Віцебскай вобласці, што не дало магчымасці скласці поўнае ўяўленне аб музейнай сетцы Беларусі. Акрамя таго, хацелася б адзначыць, што ўзнікалі пэўныя недарэчнасці

[2] Да 2009 г. музейная (азнаямляльная) практыка праходзіла ў два этапы. Першы з іх праводзіўся па-за сеткай раскладу ў вясновым семестры.

Репозиторий ВГУ

па прычыне неабходнасці запаўнення дзённіка і адначасовага праслухоўвання экскурсіі. У сувязі з неабходнасцю вылучэння найбольш каштоўных экспанатаў трэба было іх бліжэй разглядаць і запісваць назвы, але ва ўмовах адначасовага праслухоўвання экскурсіі гэта цяжка рабіць, а дадатковага часу для самастойнага прагляду экспазіцыі часта не было. У некаторых экспазіцыях было цяжка вылучыць раздзелы.

Нягледзячы на выказаныя вышэй заўвагі, у цэлым хочацца адзначыць даволі высокі ўзровень арганізацыі практыкі, яе вялікую змястоўнасць і цікавасць. Спадзяюся, што невялікія недахопы ў арганізацыі музейнай (азнаямляльнай) практыкі будуць у далейшым выпраўлены і яна заўсёды будзе праходзіць паспяхова і карысна для студэнтаў.

*Дата* *Подпіс*

Репозиторий ВГУ

## СПІС РЭКАМЕНДУЕМАЙ ЛІТАРАТУРЫ


1. 90 год Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею: матэрыялы навук. канф., Віцебск, 30–31 кастр. 2008 г. / рэдкал. Г.У. Савіцкі [і інш.]. – Мн., 2009.
2. Беларускія музеі: Гісторыя, хроніка, сучаснасць. – Мн., 1998.
3. Варанкова У. Беларускі дзяржаўны музей Вялікай Айчыннай вайны // БГЧ. – 2004. – № 10.
4. Глазырын Я.У. Полацк – горад музеяў // БГЧ. – 2007. – № 8.
5. Гнедовский М.Б. Музейная экспозиция // Сов. музей. – 1987. – № 6.
6. Гужалоўскі А.А. Музеі Беларусі (1941–1991гг.). – Мн., 2004.
7. Исторические экспозиции региональных музеев в постсоциалистический период / отв. ред. И.В. Чувилова. – СПб., 2009.
8. Калбаска А. Музейны дыярыуш, ці Уваходзіны ў новую музеялогію / А. Калбаска. – Мн., 2000.
9. Курылёнак В. Музеі-запаведнікі Беларусі // БГЧ. – 2003. – № 9.
10. Кучар З. Жывая памяць мастацтва // БГЧ. – 2003. – № 3.
11. Маслоўскі С. Музеі Віцебскай вобласці // БГЧ. – 2000. – № 2.
12. Михайловская А.И. Музейная экспозиция: Организация и техника. – М., 1964.
13. Музееведение. Музеи исторического профиля: учеб. пособие для вузов / под ред. К.Г. Левыкина, В.Хербста. – М., 1988.
14. Музеі Беларусі: Інфармацыя аб музеях Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь / склад. А.Б. Сташкевіч і інш. – Мн.: 2001 г.
15. Музеі Беларусі. Музеи Беларуси: Энцыклапедычны даведнік. – Мн., 2008.
16. Музеі Беларусі [электрон. рэсурс]. – Рэжым доступа: www.museum.by
17. Музеи России [электрон. ресурс]. – Режим доступа: www.museum.ru
18. Основы музееведения: учеб. пособие / отв. ред. Э.А. Шулепова. – М., 2005.
19. Полацк музейны / аўт.-склад. Т.А. Джумантаева, М.М. Ільніцкі. – Мн., 2006.
20. Пракапцоў У. Беларуская скарбніца культуры // БГЧ. – 2004. – № 2.
21. Российская музейная энциклопедия: в 2 т. / Рос. ин-т культурологии; редкол.: В.Л. Янин (предс.) и др. – М., 2001.
22. Савіцкі Г.У. Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею – 90 гадоў // БГЧ. – 2008. – № 10.




Репозиторий ВГУ

23. Сотникова С.И. Музеология: пособие для вузов / С.И. Сотникова. – М., 2004.

24. Сташкевіч А.Б. Распрацоўка тыпалогіі музеяў Беларусі. Асноўныя падыходы // Аператыўная інфармацыя па праблемах культуры і мастацтва. – Мн., 1999.

25. Тельчаров, А.Д. Основы музейного дела: Введение в специальность: учеб. пособие / А.Д. Тельчаров. – М., 2005.

26. Хмяльніцкая Л. З гісторыі Віцебскага царкоўна-археалагічнага музея // Віцебскі сшытак. – 1995. – № 1.

27. Шляхтина, Л.М. Основы музейного дела: теория и практика. Учеб. пособие / Л.М. Шляхтина. – М., 2005.

28. Юренева Т.Ю. Музееведение / Т.Ю. Юренева. – М., 2004.

29. International Council of Museums (ICOM, Міжнародны савет музеяў) / ICOM, Maison de l'UNESCO/ – Paris, 2008–2010. – Рэжым доступу: www.icom.museum.

Репозиторий ВГУ

**ЗМЕСТ**

**УВОДЗІНЫ** .................................................................................... 3

**МЭТА, ЗАДАЧЫ І ЗМЕСТ ПРАКТЫКІ** ........................................... 5

**ТЭАРЭТЫЧНЫ МІНІМУМ**.................................................................... 8

**МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ПРАХОДЖАННІ ПРАКТЫКІ І АФАРМЛЕННІ ДАКУМЕНТАЦЫІ** ........................ 16

**ДАДАТКІ** ........................................................................................ 21

Дадатак 1. АБ МУЗЕЯХ І МУЗЕЙНЫМ ФОНДЗЕ .............................. РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ. ............................................................... 21

ЗАКОН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ................................................... 21

Дадатак 2. ПАЛАЖЭННЕ АБ АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННІ МУЗЕЙНАЙ (АЗНАЯМЛЯЛЬНАЙ) ПРАКТЫКІ НА ГІСТАРЫЧНЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ...................................................... 34

Дадатак 3. МУЗЕІ БЕЛАРУСІ, РЭКАМЕНДАВАНЫЯ ДЛЯ НАВЕДВАННЯ ПАДЧАС ПРАХОДЖАННЯ ПРАКТЫКІ ............. 37

Дадатак 4. УЗОРЫ АФАРМЛЕННЯ СПРАВАЗДАЧНЫХ ДАКУМЕНТАЎ ПРАКТЫКІ .............................................................. 41

**СПІС РЭКАМЕНДУЕМАЙ ЛІТАРАТУРЫ**..................................... 53

Репозиторий ВГУ

Репозиторий ВГУ